ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Чацвер, 3 сакавіка 1938 г., № 12 (354)

Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення ССПБ і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

АБ ЗАЦВЕРДЖАННІ „ПАЛАЖЭННЯ АБ ВЫБАРАХ У ВЯРХОУНЫ СОВЕТ БССР“

Пастанова VIII сесіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР XI склікання

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР ПАСТАНАУЛЯЕ:

Зацвердзіць «Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай Совецкай Сацыялістычнай Рэспублікі».

Выкн. аб. старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР Н. НАТАЛЁВІЧ.

Выкн. аб. сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР А. ЕРМАК.

27 лютага 1938 г.
г. Менск.

ШКОЛА БОЛЬШЭВІЦКАГА ВЫХАВАННЯ

Народы Совецкага Саюза з вялікай палітычнай актыўнасцю рыхтуюцца да выбараў у Вярхоўныя Советы саюзных рэспублік. Выбары рэспубліканскіх вярхоўных органаў улады праходзяць у адпаведнасці са сталінскім выбарчым законам, па якому мы выбіралі Вярхоўны Совет СССР. Гэтыя выбары — другое выступленне сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

На сесіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР, што нядаўна закончыла сваю працу, шырока абгаварваўся выбарчы закон нашай рэспублікі. Дзяржаўныя дзеячы Совецкай Беларусі, рабочыя, калгаснікі, прадстаўнікі совецкай інтэлігенцыі дэталёва разбіралі кожны артыкул Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР. Яны гаварылі аб небывалым уздыме эканомікі, культуры беларускага народа, сагрэтага цяшчотнымі праменнямі Сталінскай Канстытуцыі.

Бліскучы малюнак росту нашай народнай гаспадаркі намаляваў у сваім дакладзе на сесіі выконваючы абавязкі старшыні ЦВК БССР тав. Н. Я. Наталевіч. Перамогі Совецкай Беларусі заваяваны нашым народам пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі большэвікоў, Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) на чале з вялікім Сталіным, пры братняй дапамозе іншых народаў Совецкага Саюза і ў першую чаргу гераічнага рускага народа.

Аб гэтым гаварылі ўсе прамоўцы па сесіі ЦВК БССР, аб гэтым гаворыць увесь беларускі народ.

Сесія зацвердзіла «Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР». Совецкая Беларусь мае свой выбарчы закон, закон — блізкі да аналагічных законаў іншых саюзных рэспублік выпрацаваны на аснове Сталінскай Канстытуцыі, самай дэмакратычнай Канстытуцыі ў свеце.

Выбары будуць праведзены на аснове ўсеагульнага, прамога, роўнага выбарчага права пры тайным галасаванні. Свабодны беларускі народ, які да Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі не меў сваёй дзяржаўнасці, быў прыгнечаным, прыдушаны рускім царызмам, мае права нароўні з іншымі народамі выбіраць сваіх дзеячоў для кіравання дзяржавай.

У выбарах будуць прымаць удзел усе грамадзяне Совецкай Беларусі, дасягнуўшыя восемнаццаці год, акрамя асоб страціўшых розум і асоб, асуджаных судом з пазбаўленнем выбарчых праvoў. Нароўні з усімі грамадзянамі правам выбіраць і быць выбранымі карыстаюцца жанчыны, а таксама камандзіры, байцы і палітработнікі Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Выбарчае права не абмяжоўваецца расавай і нацыянальнай прыналежнасцю, веравызнаннем, адукацыйным і маёмасным цэнзам, аселасцю і мінулай дзейнасцю грамадзян. Нічога падобнага няма ў буржуазных канстытуцыях і буржуазных выбарчых законах.

Такі дэмакратычны выбарчы закон можа мець толькі наша краіна, дзе паспяхова закончаны магутны, казачна прыгожы будынак социялізма, дзе няма эксплуатацыі чалавека чалавекам, дзе прынята вялікая і мудрая хартыя чалавечых правоў — Сталінская Канстытуцыя.

У сваёй геніяльнай працы «Дзяржава і рэволюцыя» Ленін пісаў: «у капіталістычным грамадстве пры ўмове найбольш спрыяльнага развіцця яго, мы маем больш альбо менш поўны дэмакратызм у дэмакратычнай рэспубліцы. Але гэты дэмакратызм заўсёды сціснуты цеснымі рамкамі капіталістычнай эксплуатацыі і заўсёды застаецца пагэтаму, па сутнасці, дэмакратызмам для меншасці, толькі для маемасных класаў, толькі для багатых».

Далей Владзімір Ільіч пісаў: «Дэмакратыя для гіганцкай большасці народа і падаўленне сілай, г. зн. выключэнне з дэмакратыі, эксплуататараў, прыгнятальнікаў народа, — вось якое відазмяненне дэмакратыі пры **пераходзе** ад капіталізма да комунізма». Дэмакратыя для абсалютнай большасці заваявана нашым народам, нашай партыяй Леніна—Сталіна ў жудасных баях з замежнымі і ўнутранымі ворагамі.

З прыняццем Палажэння аб выбарах Совецкая Беларусь уступіла ў перадвыбарчую кампанію. У кожным кутку рэспублікі, у калгасах, на заводах адчуваецца пульс жыцця і творчасці. Народ з вялікім натхненнем вывучае свой выбарчы закон. Партыйныя і совецкія арганізацыі разгортваюць масавую агітацыю і прапаганду сярод выбаршчыкаў.

Недалёкі той час, калі народ выставіць першых кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР — партыйных і непартыйных большэвікоў, верных сыноў радзімы. Выбарчая кампанія вылучыць дзесяткі новых дзеячоў з народа, старанна ўзрошчаных і выпеставаных нашай партыяй, нашым бацькам і настаўнікам геніяльным Сталіным.

У гістарычны дзень 12 снежня 1937 года — дзень выбараў у Вярхоўны Совет СССР, увесь беларускі народ адзінай, маналітнай, згуртаванай сям'ёй галасаваў за сталінскі блок комуністаў і беспартыйных, за вялікага Сталіна, за яго вернага друга і саратніка, палкаводца социялістычнай арміі Кліма Варашылава.

Работнікі мастацкага фронта Беларусі маюць багаты і павучальны вопыт работы па выбарах у Вярхоўны Совет Саюза ССР. Беларускія пісьменнікі, мастакі, акторы, кампазітары ў выбарчай кампаніі праявілі вялікую палітычную актыўнасць. Мастацкімі сродкамі яны прапагандавалі выбарчы закон, агітавалі за кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета нашай радзімы. Верш, песня, нарыс, інтэрмедыя, вершаваны лозунг, — усё гэта было пастаўлена на службу выбарам.

Узброеныя добрым вопытам работнікі мастацкага фронта ў надыходзячую выбарчую кампанію павінны папрацаваць яшчэ больш інтэнсіўна. Акрамя вывучэння выбарчага закона па калектывах, неабходна ўжо зараз разгарнуць выбарчую прапаганду мастацкімі сродкамі на прадпрыемствах і ўстановах. Патрэбна ўсе сродкі агітацыі і прапаганды прывесці ў баявую гатоўнасць, падрыхтаваць да справы.

Шмат тэм не адлюстравана яшчэ ў мастацтве БССР. Краіна чакае ад работнікаў літаратуры, тэатраў, кіно, выяўленчага мастацтва твораў пра тое, як беларускі народ дамогся сваёй дзяржаўнасці, палітычнай і социяльнай свабоды. Дзяржаўнасць нашаму народу даў таварыш Сталін. Якая благародная, ганаровая тэма для работнікаў мастацтва! Народ чакае твораў аб гераічных буднях нашых заходніх вартавых — пагранічнікаў, якія пад кіраўніцтвам вернага сталінца тав. Ежова сурова, бязлітасна змагаюцца з ворагамі народа, шпіёнамі, з трацкісцка-бухарынскай бандай.

Нядаўна выйшла з друку кніга Аляксея Талстога «Хлеб» пра гераічную абарону Царыцына. Абавязак пісьменнікаў БССР стварыць такія-ж мастацкія палотны аб грамадзянскай вайне на Беларусі, аб удзеле ў ёй відных дзеячоў комуністычнай партыі тт. Кагановіча, Фрунзе, Орджанікідзе, Ежова. Гэтыя тэмы хвалююць і натхняюць кожнага работніка мастацтва, асабліва зараз, калі беларускі народ святкуе ўрачыстасць совецкай дэмакратыі — прыняцце свайго выбарчага закона.

У народны парламент нашай рэспублікі народ вылучыць кандыдатамі і сваіх лепшых песняроў, сваіх лепшых актораў, якія ўсю здольнасць, усё старанне аддавалі і аддаюць народу, узбагачаючы беларускую культуру, нацыянальную па форме і социялістычную па зместу, новымі творамі мастацтва. Гонар быць народным выбраннікам у Вярхоўны Совет сваёй социялістычнай дзяржавы.

Фашысцкія узурпатары, азвярэлыя па нагласці бандыты з псарні Троцкага, Бухарына, Рыкава канчаткова не склалі сваёй зброі. Іх труслівыя паследышы будуць яшчэ імкнуцца расстроіць нашы рады ў часе выбарчай кампаніі. Будзем помніць аб гэтым. Будзем выкрываць і бязлітасна знішчаць усіх трацкісцка-бухарынскіх палкалоднікаў.

Выбарчая кампанія — школа большэвіцкага выхавання шырокіх мас народа. Трэба ўсе віды мастацтва сканцэнтраваць на дапамогу кіраўнікам гэтай школы — партыйным і непартыйным большэвікам-сталінцам.

ПАЛАЖЭННЕ АБ ВЫБАРАХ У ВЯРХОУНЫ СОВЕТ БЕЛАРУСКАЙ ССР

РАЗДЗЕЛ I.

ВЫБАРЧАЯ СІСТЭМА

Артыкул 1. На падставе артыкула 109 Канстытуцыі Беларускай ССР выбары дэпутатаў у Вярхоўны Совет Беларускай ССР праводзяцца выбаршчыкамі на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні.

Артыкул 2. На падставе артыкула 110 Канстытуцыі Беларускай ССР выбары дэпутатаў з'яўляюцца ўсеагульнымі: усе грамадзяне Беларускай ССР, дасягнуўшыя 18 год, незалежна ад расавай і нацыянальнай прыналежнасці, веравызнання, адукацыйнага цэнза, аседласці, социяльнага паходжання, маемаснага становішча і мінулай дзейнасці, маюць права ўдзельнічаць у выбарах дэпутатаў і быць выбранымі ў Вярхоўны Совет Беларускай ССР, за выключэннем страціўшых розум і асоб, асуджаных судом з пазбаўленнем выбарчых правоў.

Артыкул 3. На падставе артыкула 111 Канстытуцыі Беларускай ССР выбары дэпутатаў з'яўляюцца роўнымі: кожны грамадзянін мае адзін голас; усе грамадзяне прымаюць удзел у выбарах на роўных падставах.

Артыкул 4. На падставе артыкула 112 Канстытуцыі Беларускай ССР жанчыны карыстаюцца правам выбіраць і быць выбранымі нароўні з мужчынамі.

Артыкул 5. На падставе артыкула 113 Канстытуцыі Беларускай ССР грамадзяне, якія знаходзяцца ў радах Чырвонай Арміі, карыстаюцца правам выбіраць і быць выбранымі нароўні з усімі грамадзянамі.

Артыкул 6. На падставе артыкула 116 Канстытуцыі Беларускай ССР кандыдаты пры выбарах выстаўляюцца па выбарчых акругах.

РАЗДЗЕЛ II.

СПІСЫ ВЫБАРШЧЫКАЎ

Артыкул 7. Спісы выбаршчыкаў складаюцца ў гарадах гарадскім Советам дэпутатаў працоўных, а ў гарадах з раённым падзелам — раённым Советам; у сельскіх мясцовасцях — сельскім (сяла, вёскі, мястэчка, пасёлка) Советам дэпутатаў працоўных.

Артыкул 8. У спісы выбаршчыкаў уключаюцца ўсе грамадзяне, якія маюць выбарчае права і пражываюць (пастаянна ці часова) к моманту складання спісаў на тэрыторыі данага Совета, дасягнуўшыя к дню выбараў 18 год.

Артыкул 9. Не ўносяцца ў спісы выбаршчыкаў асобы, пазбаўленыя выбарчых правоў па судовых прыгаворах на працягу ўсяго ўстаноўленага ў прыгаворы тэрміну пазбаўлення выбарчых правоў, а таксама асобы, прызнаныя ва ўстаноўленым законам парадку страціўшымі розум.

Артыкул 10. Спісы выбаршчыкаў складаюцца па кожнаму выбарчаму ўчастку ў алфавітным парадку з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку, узросту і месца жыхарства выбаршчыка і падпісваюцца старшынёю і сакратаром Совета дэпутатаў працоўных.

Артыкул 11. Ніхто з выбаршчыкаў не можа быць унесен больш, чым у адзін выбарчы спіс.

Артыкул 12. Спісы выбаршчыкаў, якія знаходзяцца ў вайсковых часцях і вайсковых злучэннях, складаюцца камандаваннем за подпісамі камандзіра і ваеннага камісара. Усе іншыя ваеннаслужачыя ўносяцца ў спісы выбаршчыкаў па месцу жыхарства адпаведнымі Советамі дэпутатаў працоўных.

Артыкул 13. Спісы выбаршчыкаў выбарчых участкаў, ствараемых пры больніцах, радзільных дамах, санаторыях і іншых лячэбных установах, складаюцца як на хворых грамадзян, так і на медыцынскі персанал, які знаходзіцца на дзяжурстве ў дзень выбараў.

У выбарах не могуць прымаць удзел хворыя, якія знаходзяцца ў скарлатынозных і дыфтэрыйных аддзяленнях.

Артыкул 14. За 30 дзён да выбараў Совет дэпутатаў працоўных вывешвае спісы выбаршчыкаў для ўсеагульнага агляду або забяспечвае выбаршчыкам магчымасць азнаямляцца з гэтымі спісамі ў памяшканні Совета.

Артыкул 15. Арыгінал спісаў выбаршчыкаў захоўваецца адпаведна ў Совеце дэпутатаў працоўных і ў вайсковай часці ці ў вайсковым злучэнні.

Артыкул 16. Пры перамене выбаршчыкам месца свайго прабывання ў тэрмін паміж апублікаваннем спіса выбаршчыкаў і днём выбараў адпаведны Совет дэпутатаў працоўных выдае яму па форме, устаноўленай Цэнтральнай выбарчай камісіяй, «пасведчанне на права галасавання» і адзначае ў спісе выбаршчыкаў — «выбыў»; у пункце новага месцажыхарства — пастаяннага ці часовага — выбаршчык уносіцца ў спіс выбаршчыкаў пры прад'яўленні пасведчання асобы, а таксама «пасведчання на права галасавання».

Артыкул 17. Заявы аб няправільнасці ў спісе выбаршчыкаў (неўключэнне ў спіс, выключэнне са спіса, скажэнне прозвішча, імя, імя па бацьку, няправільнае ўключэнне ў спіс асоб, пазбаўленых выбарчых правоў) падаюцца ў Совет дэпутатаў працоўных, які апублікаваў спіс.

Артыкул 18. Выканаўчы камітэт Совета дэпутатаў працоўных абавязан разгледзець кожную заяву аб няправільнасці ў спісе выбаршчыкаў у трохдзённы тэрмін.

Артыкул 19. Пасля разгляду заявы аб няправільнасці ў спісе выбаршчыкаў, выканаўчы камітэт Совета дэпутатаў працоўных абавязан або ўнесці неабходныя выпраўленні ў спіс выбаршчыкаў, або выдаць заяўніцелю пісьмовую даведку аб матывах адхілення яго заявы; пры нязгодзе з рашэннем Совета дэпутатаў працоўных заявіцель можа падаць скаргу ў народны суд.

Артыкул 20. Народны суд на працягу трох дзён абавязан у адкрытым судовым пасяджэнні з выклікам заявіцеля і прадстаўніка Совета разгледзець скаргу на няправільнасць у спісе і сваё рашэнне неадкладна паведаміць як заявіцелю, так і Совету. Рашэнне народнага суда канчатковае.

РАЗДЗЕЛ III.

ВЫБАРЧЫЯ АКРУГІ ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ БССР

Артыкул 21. На падставе артыкула 21 Канстытуцыі БССР Вярхоўны Совет БССР выбіраецца грамадзянамі БССР па выбарчых акругах.

Артыкул 22. Выбарчая акруга па выбарах у Вярхоўны Совет БССР складаецца па прынцыпу: 20.000 насельніцтва — на акругу. Кожная выбарчая акруга па выбарах у Вярхоўны Совет БССР пасылае аднаго дэпутата.

Артыкул 23. Утварэнне выбарчых акруг па выбарах у Вярхоўны Совет БССР праводзіцца Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР.

Артыкул 24. Спіс выбарчых акруг па выбарах у Вярхоўны Совет БССР апублікоўваецца Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР адначасова з назначэннем дня выбараў.

РАЗДЗЕЛ IV.

ВЫБАРЧЫЯ ЎЧАСТКІ

Артыкул 25. Для прыёму выбарчых бюлетэняў і падліку галасоў тэрыторыя гарадоў і раёнаў, што ўваходзяць у выбарчыя акругі па выбарах у Вярхоўны Совет БССР, падзяляецца на выбарчыя ўчасткі.

Артыкул 26. Утварэнне выбарчых участкаў праводзіцца ў гарадах гарадскімі Советамі дэпутатаў працоўных, у гарадах з раённым падзелам—раённымі Советамі дэпутатаў працоўных; у сельскіх мясцовасцях — раённымі Советамі дэпутатаў працоўных.

Артыкул 27. Утварэнне выбарчых участкаў праводзіцца не пазней, чым за 45 дзён да выбараў.

Артыкул 28. Тэрыторыя сельсовета, які налічвае не больш 2.000 насельніцтва, складае, як правіла, адзін выбарчы ўчастак; у кожным сяле, вёсцы, пасёлку, мястэчку, якое налічвае ад 500, але не больш 2.000 насельніцтва, арганізоўваецца асобны выбарчы ўчастак.

У паселішчах або групе паселішч з насельніцтвам менш 500 чалавек, але не ніжэй 300 чалавек, у тых выпадках, калі адлегласць такіх паселішч да цэнтра выбарчага ўчастка перавышае 10 кіламетраў, могуць быць утвораны асобныя выбарчыя ўчасткі.

Артыкул 29. У паасобных раёнах Палескай вобласці, дзе пераважаюць дробныя паселішчы, дапускаецца з дазволу Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР арганізацыя выбарчых участкаў з колькасцю не менш 100 чалавек насельніцтва.

Артыкул 30. Гарады, рабочыя пасёлкі, а таксама сёлы і тэрыторыя сельсовета, якія налічваюць больш 2.000 насельніцтва, падзяляюцца на выбарчыя ўчасткі з разліку адзін выбарчы ўчастак на 1.500—2.500 чалавек насельніцтва.

Артыкул 31. Воінскія часці і вайсковыя злучэнні складаюць асобныя выбарчыя ўчасткі з колькасцю не менш 50 і не больш 1.500 выбаршчыкаў, якія ўваходзяць у выбарчую акругу па месцу знаходжання часці або вайсковага злучэння.

Артыкул 32. Пры больніцах, радзільных дамах, санаторыях, дамах інвалідаў з колькасцю выбаршчыкаў не менш 50 утвараюцца асобныя выбарчыя ўчасткі.

У больніцах з некалькімі карпусамі дапускаецца ўтварэнне выбарчых участкаў пры асобных карпусах пры наяўнасці ў кожным з іх не менш 50 выбаршчыкаў.

У больніцах і іншых лячэбных установах, дзе асобныя выбарчыя ўчасткі не арганізоўваюцца, дапускаецца прыём выбарчых бюлетэняў у саміх больніцах і лячэбных установах вылучанымі членамі выбарчых камісій. У гэтых выпадках больніцы снабжаюцца асобнымі выбарчымі скрынкамі.

Артыкул 33. Судны з колькасцю выбаршчыкаў не менш 25, знаходзячыяся ў плаванні ў дзень выбараў, могуць саставіць асобныя выбарчыя ўчасткі, уваходзячыя ў выбарчыя акругі па месцу прыпіскі судна.

РАЗДЗЕЛ V.

ВЫБАРЧЫЯ КАМІСІІ

Артыкул 34. Цэнтральная выбарчая камісія па выбарах у Вярхоўны Совет БССР складаецца з прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных і зацвярджаецца Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР адначасова з апублікаваннем дня выбараў.

Артыкул 35. Цэнтральная выбарчая камісія ўтвараецца ў складзе старшыні, намесніка старшыні, сакратара і 10 членаў.

Артыкул 36. Цэнтральная выбарчая камісія:

а) наглядае на ўсёй тэрыторыі БССР за няўхільным выкананнем у ходзе выбараў «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР»;

б) разглядае скаргі на няправільныя дзеянні выбарчых камісій і выносіць па скаргах канчатковыя рашэнні;

в) устанаўляе ўзоры пячатак выбарчых скрынак, форму «пасведчання на права галасавання», форму і колер выбарчых бюлетэняў і канвертаў для іх, форму спісу выбаршчыкаў, форму пратаколаў па падліку галасоў, форму пасведчання аб выбранні;

г) рэгіструе выбраных дэпутатаў у Вярхоўны Совет БССР;

д) здае мандатнай камісіі Вярхоўнага Совета БССР справаводства па выбарах.

Артыкул 37. У кожнай выбарчай акрузе па выбарах у Вярхоўны Совет БССР утвараецца Акруговая па выбарах у Вярхоўны Совет БССР выбарчая камісія.

Артыкул 38. Акруговыя па выбарах у Вярхоўны Совет БССР выбарчыя камісіі складаюцца з прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных і зацвярджаюцца абласнымі Советамі дэпутатаў працоўных не пазней, чым за 55 дзён да выбараў.

Артыкул 39. Акруговая па выбарах у Вярхоўны Совет БССР выбарчая камісія ўтвараецца ў складзе старшыні, намесніка старшыні, сакратара і 6 членаў.

Артыкул 40. Акруговая па выбарах у Вярхоўны Совет БССР выбарчая камісія:

а) наглядае за своечасовай арганізацыяй выбарчых участкаў адпаведнымі выканаўчымі камітэтамі Советаў дэпутатаў працоўных;

б) устанаўляе парадкавыя нумары выбарчых участкаў;

в) наглядае за своечасовым складаннем і давядзеннем да ўсеагульнага ведама спісаў выбаршчыкаў;

г) рэгіструе выстаўленых з захаваннем патрабаванняў Канстытуцыі БССР і «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР;

д) снабжае ўчастковыя выбарчыя камісіі выбарчымі бюлетэнямі і канвертамі па ўстаноўленай форме;

е) робіць падлік галасоў і ўстанаўляе рэзультаты выбараў па акрузе;

ж) прадстаўляе ў Цэнтральную выбарчую камісію справаводства па выбарах;

з) выдае выбранаму дэпутату пасведчанне аб выбранні.

Артыкул 41. Участковыя выбарчыя камісіі складаюцца з прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных і зацвярджаюцца ў гарадах гарадскімі Советамі дэпутатаў працоўных, а ў гарадах з раённым падзелам — раённымі Советамі дэпутатаў працоўных; у сельскіх мясцовасцях — раённымі Советамі дэпутатаў працоўных — не пазней, чым за 40 дзён да выбараў.

Артыкул 42. Участковая выбарчая камісія ўтвараецца ў складзе старшыні, намесніка старшыні, сакратара і 2—6 членаў.

Артыкул 43. Участковая выбарчая камісія:

а) робіць па выбарчаму ўчастку прыём выбарчых бюлетэняў;

б) робіць падлік галасоў па кожнаму кандыдату ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР;

в) перадае справаводства па выбарах у Акруговую выбарчую камісію.

Артыкул 44. Пасяджэнні Цэнтральнай выбарчай камісіі, Акруговых і Участковых выбарчых камісій лічацца сапраўднымі, калі на іх прымае ўдзел больш паловы агульнага складу камісій.

Артыкул 45. Усе пытанні ў выбарчых камісіях вырашаюцца простай большасцю галасоў; пры роўнасці галасоў — голас старшыні дае перавагу.

Артыкул 46. Выдаткі, звязаныя з правядзеннем выбараў у Вярхоўны Совет БССР, робяцца за кошт дзяржавы.

Артыкул 47. Цэнтральная выбарчая камісія, Акруговыя і Участковыя выбарчыя камісіі маюць сваю пячатку па ўзору, устаноўленаму Цэнтральнай выбарчай камісіяй.

РАЗДЗЕЛ VI.

ПАРАДАК ВЫСТАЎЛЕННЯ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Артыкул 48. Права выстаўлення кандыдатаў у Вярхоўны Совет БССР забяспечваецца за грамадскімі арганізацыямі і таварыствамі працоўных — на падставе артыкула 116 Канстытуцыі БССР: за комуністычнымі партыйнымі арганізацыямі, прафесіянальнымі саюзамі, каапэратывамі, арганізацыямі моладзі, культурнымі таварыствамі і іншымі арганізацыямі, зарэгістраванымі па ўстаноўленым законам парадку.

Артыкул 49. Права выстаўлення кандыдатаў ажыццяўляюць як рэспубліканскія органы грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных, так і іх абласныя і раённыя органы, таксама як агульныя сходы рабочых і служачых па прадпрыемствах, чырвонаармейцаў — па воінскіх часцях, а таксама агульныя сходы сялян — па калгасах, рабочых і служачых соўгасаў — па соўгасах.

Артыкул 50. Кандыдаты ў дэпутаты не могуць быць членамі Акруговых па выбарах у Вярхоўны Совет БССР выбарчых камісій, а таксама Участковых выбарчых камісій той акругі, дзе яны выстаўлены кандыдатамі ў дэпутаты.

Артыкул 51. Не пазней, чым за 30 дзён да выбараў, усе грамадскія арганізацыі або таварыствы працоўных, якія вылучаюць кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, абавязаны зарэгістраваць кандыдатаў у дэпу-

(Працяг на 2-й стар.).



«Вызваленне Беларусі ад белапалякаў». Барэльеф работы Бембеля.

Фота І. Каплінскага.

ПАЛАЖЭННЕ АБ ВЫБАРАХ У ВЯРХОУНЫ СОВЕТ БЕЛАРУСКАЙ ССР

таты ў адпаведнай Акруговай па выбарах у Вярхоўны Совет БССР выбарчай камісіі.

Артыкул 52. Акруговыя па выбарах у Вярхоўны Совет БССР выбарчыя камісіі абавязаны зарэгістраваць усіх кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, выстаўленых грамадскімі арганізацыямі і таварыствамі працоўных з захаваннем патрабаванняў Канстытуцыі БССР і «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР».

Артыкул 53. Грамадская арганізацыя ці таварыства працоўных, якія вылучаюць кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, абавязаны прадставіць у Акруговую выбарчую камісію наступныя дакументы:

а) пратакол схода ці пасяджэння, вылучыўшага кандыдата ў дэпутаты, падпісаны членамі Прэзідыума, з указаннем іх узросту, месцажыхарства, назвы арганізацыі, вылучыўшай кандыдата, указання аб месцы, часе і колькасці ўдзельнікаў схода ці пасяджэння, вылучыўшага кандыдата ў дэпутаты, прычым у пратаколе павінны быць указаны прозвішча, імя, імя па бацьку кандыдата ў дэпутаты, яго ўзрост, месцажыхарства, партыйнасць, заняткі;

б) заяву кандыдата ў дэпутаты аб яго згодзе балатыравацца па данай выбарчай акрузе ад выставіўшай яго арганізацыі.

Артыкул 54. Кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР можа галасавацца толькі ў адной акрузе.

Артыкул 55. Адмаўленне Акруговай па выбарах у Вярхоўны Совет БССР выбарчай камісіі ў рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты можа быць абскарджана ў двухдзённы тэрмін у Цэнтральную выбарчую камісію, рашэнне якой з'яўляецца канчатковым.

Артыкул 56. Прозвішча, імя, імя па бацьку, узрост, заняткі, партыйнасць кожнага зарэгістраванага кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР і назва грамадскай арганізацыі, вылучыўшай кандыдата, апублікоўваюцца Акруговай выбарчай камісіяй не пазней, чым за 25 дзён да выбараў.

Артыкул 57. Усе зарэгістраваныя кандыдаты ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР падлягаюць абавязковаму ўключэнню ў выбарчы бюлетэнь.

Артыкул 58. Акруговыя па выбарах у Вярхоўны Совет БССР выбарчыя камісіі абавязаны не пазней, чым за 15 дзён да выбараў у Вярхоўны Совет БССР, надрукаваць і разаслаць усім Участковым выбарчым камісіям выбарчыя бюлетэні.

Артыкул 59. Выбарчыя бюлетэні друкуюцца на мовах насельніцтва адпаведнай выбарчай акругі.

Артыкул 60. Выбарчыя бюлетэні друкуюцца па форме, устаноўленай Цэнтральнай выбарчай камісіяй, і ў колькасці, якая забяспечвае снабжэнне ўсіх выбаршчыкаў выбарчымі бюлетэнямі.

Артыкул 61. Кожнай арганізацыі, выставіўшай кандыдата, зарэгістраванага ў Акруговай выбарчай камісіі, таксама як кожнаму грамадзяніну БССР, забяспечваецца права беспераШкоднай агітацыі за гэтага кандыдата на сходах, у друку і іншымі спосабамі, згодна артыкула 100 Канстытуцыі БССР.

РАЗДЗЕЛ VII.

ПАРАДАК ГАЛАСАВАННЯ

Артыкул 62. Выбары ў Вярхоўны Совет БССР праводзяцца на працягу аднаго дня — агульнага для БССР.

Артыкул 63. Дзень выбараў у Вярхоўны Совет БССР устанаўляецца Прэзідыумам Вярхоўнага Совета БССР не пазней, чым за 2 месяцы да тэрміну выбараў. Выбары праводзяцца ў нерабочы дзень.

Артыкул 64. Штодзень на працягу апошніх 20 дзён перад выбарамі Участковая выбарчая камісія апублікоўвае ці шырока паведамляе выбаршчыкаў якім-небудзь іншым спосабам аб дні выбараў і месцы выбараў.

Артыкул 65. Падача галасоў выбаршчыкамі робіцца ў дзень выбараў ад 6 гадзін раніцы да 12 гадзін ночы па мясцоваму часу.

Артыкул 66. У 6 гадзін раніцы ў дзень выбараў старшыня Участковай выбарчай камісіі ў прысутнасці яе членаў правярае выбарчыя скрынкі і наяўнасць складзенага па ўстаноўленай форме спісу выбаршчыкаў, пасля чаго закрывае і апячатвае скрынкі пячаткаю камісіі і запрашае выбаршчыкаў прыступіць да падачы галасоў.

Артыкул 67. Кожны выбаршчык галасуе асабіста, з'яўляючыся для гэтага ў памяшканне для галасавання, прычым падача галасоў выбаршчыкамі робіцца шляхам апускання ў выбарчую скрынку выбарчага бюлетэня, запячатанага ў канверт.

Артыкул 68. У памяшканні для выбараў выдзяляецца для запаўнення бюлетэняў асобны пакой, у якім у часе галасавання забараняецца прысутнасць каго-б та ні было, у тым ліку і членаў Участковай выбарчай камісіі, апрача галасуючых; пры допуску ў пакой для запаўнення бюлетэняў аднача́сова некалькіх выбаршчыкаў, ён павінен быць абсталяван перагародкамі ці шырмамі па ліку дапускаемых аднача́сова выбаршчыкаў.

Артыкул 69. Выбаршчык, які з'явіўся ў выбарчае памяшканне, прад'яўляе сакратару ці члену Участковай выбарчай камісіі або пашпарт, або калгасную кніжку, або прафсаюзны білет, або іншае пасведчанне асобы і пасля праверкі па спісу выбаршчыкаў і адзнакі ў спісе выбаршчыкаў атрымлівае выбарчы бюлетэнь і канверт устаноўленага ўзору.

Артыкул 70. На асоб, якія з'явіліся ў памяшканне для выбараў з «пасведчаннем на права галасавання», згодна артыкула 16 гэтага «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», Участковая выбарчая камісія вядзе асобны спіс, які прыкладаецца да спісу выбаршчыкаў.

Артыкул 71. Выбаршчык у пакоі, адведзеным для запаўнення выбарчых бюлетэняў, астаўляе ў выбарчым бюлетэні прозвішча таго кандыдата, за якога ён галасуе, выкрэсліваючы астатніх; улажыўшы бюлетэнь у канверт і заклеіўшы яго, выбаршчык пераходзіць у пакой, дзе змяшчаецца Участковая выбарчая камісія, і апускае канверт з выбарчым бюлетэнем у выбарчую скрынку.

Артыкул 72. Выбаршчыкі, якія не маюць магчымасці з прычыны непісьменнасці ці якога-небудзь фізічнага недахопу самастойна запоўніць выбарчы бюлетэнь, маюць права запрасіць у пакой, дзе запаўняюцца выбарчыя бюлетэні, любога іншага выбаршчыка для запаўнення выбарчага бюлетэня.

Артыкул 73. Выбарная агітацыя ў выбарчым памяшканні ў часе падачы галасоў не дапускаецца.

Артыкул 74. Адказнасць за парадак у выбарчым памяшканні нясе старшыня камісіі, і яго распараджэнні для ўсіх прысутных абавязковы.

Артыкул 75. У 12 гадзін ночы дня выбараў старшыня Участковай выбарчай камісіі абвяшчае падачу галасоў законча́най, і камісія прыступае да ўскрыцця выбарчых скрынак.

РАЗДЗЕЛ VIII.

ВЫЗНАЧЭННЕ РЭЗУЛЬТАТАЎ ВЫБАРАЎ

Артыкул 76. У памяшканні, дзе Участковая выбарчая камісія робіць падлік галасоў, пры падліку галасоў маюць права прысутнічаць спецыяльна на тое ўпаўнаважаныя прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных, а таксама прадстаўнікі друку.

Артыкул 77. Участковая выбарчая камісія, ускрыўшы скрынкі, звярае колькасць паданых канвертаў з колькасцю асоб, якія прымалі ўдзел у галасаванні, і рэзультаты зверкі заносіць у пратакол.

Артыкул 78. Старшыня Участковай выбарчай камісіі ўскрывае канверты і абвяшчае ў прысутнасці ўсіх членаў Участковай выбарчай камісіі рэзультаты галасавання па кожнаму бюлетэню.

Артыкул 79. На кожнага кандыдата ў дэпутаты вядзецца падліковы ліст у 2-х экземплярах сакратаром камісіі і ўпаўнаважанымі на тое членамі Участковай выбарчай камісіі.

Артыкул 80. Прызнаюцца несапраўднымі бюлетэні:

а) неўстаноўленага ўзору і колеру;

б) паданыя без канверта ці ў канверце неўстаноўленага ўзору;

в) з колькасцю кандыдатаў, перавышаючай лік выбіраемых дэпутатаў.

Артыкул 81. Пры ўзнікненні сумненняў у сапраўднасці выбарчага бюлетэня пытанне вырашаецца Участковай выбарчай камісіяй шляхам галасавання, што адзначаецца ў пратаколе.

Артыкул 82. Участковая выбарчая камісія складае па ўстаноўленай форме пратакол галасавання ў двух экземплярах, падпісваемых усімі членамі Участковай выбарчай камісіі, у тым ліку абавязкова старшынёю і сакратаром.

Артыкул 83. У пратаколе галасавання Участковай выбарчай камісіі павінна быць указана:

а) час пачатку і сканчэння падачы галасоў;

б) лік выбаршчыкаў, падаўшых галасы па спісу выбаршчыкаў;

в) лік выбаршчыкаў, падаўшых галасы па «пасведчаннях на права галасавання»;

г) лік паданых канвертаў;

д) кароткі выклад заяў і скарг, паданых ва Участковую выбарчую камісію, і прынятыя Участковай выбарчай камісіяй рашэнні;

е) рэзультаты падліку галасоў па кожнаму кандыдату.

Артыкул 84. Пасля сканчэння падліку галасоў і складання пратакола, старшыня камісіі абвяшчае рэзультаты галасавання ў прысутнасці ўсіх членаў камісіі.

Артыкул 85. Адзін экземпляр пратакола галасавання, складзенага Участковай выбарчай камісіяй, з абодвума экземплярамі падліковых лістоў на кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР накіроўваецца з нарачным на працягу 24 гадзін у Акруговую па выбарах у Вярхоўны Совет БССР выбарчую камісію.

Артыкул 86. Усе выбарчыя бюлетэні (асобна сапраўдныя і асобна прызнаныя несапраўднымі) павінны быць апячатаны пячаткай Участковай выбарчай камісіі і разам з другім экземплярам пратакола галасавання і пячаткай здаюцца старшынёю Участковай выбарчай камісіі на хаванне: у гарадах — гарадскім Советам дэпутатаў працоўных, а ў гарадах з раённым падзелам — раённым Советам дэпутатаў працоўных; у сельскіх мясцовасцях—раённым Советам дэпутатаў працоўных.

Артыкул 87. На Советы дэпутатаў працоўных ускладаецца абавязак захоўваць выбарчыя бюлетэні аж да зацвярджэння мандата дэпутата ад адпаведнай акругі Вярхоўным Советам БССР.

Артыкул 88. Акруговая па выбарах у Вярхоўны Совет БССР выбарчая камісія робіць падлік галасоў на падставе пратаколаў, прадстаўленых Участковымі выбарчымі камісіямі.

Артыкул 89. У памяшканні, дзе Акруговая выбарчая камісія робіць падлік галасоў, маюць права прысутнічаць пры падліку галасоў спецыяльна на тое ўпаўнаважаныя прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных, а таксама прадстаўнікі друку.

Артыкул 90. На кожнага кандыдата Акруговай выбарчай камісіі вядзецца ў 2-х экземплярах падліковы ліст, у якім адзначаецца колькасць галасоў, атрыманых кожным кандыдатам у дэпутаты.

Артыкул 91. Акруговая выбарчая камісія складае пратакол галасавання ў 2-х экземплярах, падпісваемых усімі членамі Акруговай выбарчай камісіі, у тым ліку абавязкова старшынёю і сакратаром.

Артыкул 92. У пратаколе Акруговай выбарчай камісіі павінна быць указана:

а) агульны лік выбаршчыкаў па акрузе;

б) агульны лік выбаршчыкаў, прыняўшых удзел у галасаванні;

в) лік галасоў, паданых за кожнага кандыдата ў дэпутаты;

г) кароткі выклад заяў і скарг, паданых у Акруговую выбарчую камісію, і прынятыя Акруговай выбарчай камісіяй рашэнні.

Артыкул 93. Не пазней 24 гадзін пасля сканчэння падліку галасоў старшыня Акруговай па выбарах у Вярхоўны Совет БССР выбарчай камісіі абавязан пераслаць першы экземпляр пратакола з прыкладзенымі падліковымі лістамі ў запячатаным выглядзе праз нарачнага ў Цэнтральную выбарчую камісію.

Артыкул 94. Кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, які атрымаў абсалютную большасць галасоў, г. зн. больш паловы ўсіх галасоў, паданых па акрузе і прызнаных сапраўднымі, лічыцца выбраным.

Артыкул 95. Пасля падпісання пратакола старшыня Акруговай па выбарах у Вярхоўны Совет БССР выбарчай камісіі абвяшчае рэзультаты выбараў і выдае выбранаму кандыдату ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР пасведчанне аб выбранні.

Артыкул 96. Калі ні адзін з кандыдатаў не атрымаў абсалютнай большасці галасоў, адпаведная Акруговая выбарчая камісія адзначае аб гэтым асоба ў пратаколе і паведамляе ў Цэнтральную выбарчую камісію і аднача́сова абвяшчае перабалатыроўку двух кандыдатаў, атрымаўшых найбольшую колькасць галасоў, а таксама назначае дзень перабалатыроўкі не пазней, чым у двухтыднёвы тэрмін па сканчэнні першага туру выбараў.

Артыкул 97. Калі падана́я колькасць галасоў па акрузе складае менш паловы выбаршчыкаў, маючых права галасаваць па гэтай акрузе, Акруговая па выбарах у Вярхоўны Совет БССР выбарчая камісія адзначае аб гэтым асоба ў пратаколе і паведамляе неадкладна ў Цэнтральную выбарчую камісію, прычым у гэтым выпадку Цэнтральная выбарчая камісія назначае новыя выбары не пазней, чым у двухтыднёвы тэрмін пасля першых выбараў.

Артыкул 98. Перабалатыроўка кандыдатаў у дэпутаты, таксама як новыя выбары ўзамен прызнаных несапраўднымі, праводзяцца па спісах выбаршчыкаў, складзеных для першых выбараў, і ў поўнай адпаведнасці з гэтым «Палажэннем аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР».

Артыкул 99. У выпадку выбыцця дэпутата са складу Вярхоўнага Совета БССР, Прэзідыум Вярхоўнага Совета БССР у двухтыднёвы тэрмін назначае ў адпаведнай выбарчай акрузе тэрмін выбараў новага дэпутата, але не пазней, чым у двухмесячны тэрмін пасля выбыцця дэпутата са складу Вярхоўнага Совета БССР.

Артыкул 100. Усякі, хто шляхам гвалту, ашуканства, пагроз ці подкупу будзе перашкаджаць грамадзяніну БССР у ажыццяўленні яго права выбіраць і быць выбраным у Вярхоўны Совет БССР, — караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да 2-х год.

Артыкул 101. Службовая асоба Совета ці член выбарчай камісіі, зрабіўшыя падробку выбарчых дакументаў ці заведама няправільны падлік галасоў, — караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да 3-х год.



«Лявоніха». Скульптура работы Глебава.

Фота І. Каплінскага.

ДЗВЕ ПАЭМЫ ДВУХ РОЗНЫХ КІРУНКАЎ

У апошніх нумарах «Полымя Рэвалюцыі» за мінулы год надрукаваны дзве невялікія паэмы — «Крывёю сэрца» Алеся Жаўрука і «Фелікс Дзержынскі» Эдзі Агняцвет. Абодва творы напісаны маладымі паэтамі і з'яўляюцца іхнімі першымі спробамі пяра ў эпічным жанры. Ужо адно гэта павінна прыцягнуць увагу нашых паэтаў і крытыкі да названых тэм. Апрача таго, калі чытаеш і параўноўваеш адну і другую паэму, кідаюцца ў вочы іх розныя, нават процілеглыя стылевыя асаблівасці. Іменна з гэтага пункту гледжання яны даюць цікавы матэрыял для крытычнага аналізу і іменна з гэтага пункту гледжання я і хачу пагаварыць пра іх у гэтым артыкуле.

***

Алесь Жаўрук у сваёй паэме «Крывёю сэрца» апавядае нам звычайную, але трагічную і суровую гісторыю пра іспанскую дзяўчыну, якая загінула за свабоду сваёй радзімы. Сюжэт паэмы вельмі просты, не гледзячы на тое, што ён поўны вялікага гераізму. Гэта кавалак непасрэднага жыцця, выняты, як глыба, з іспанскай зямлі, гарачай ад агню і крыві. У гэтым, па-першае, і тоіцца сіла паэмы Алеся Жаўрука. Сапраўды, хіба можа не хваляваць нас доля гераічнага іспанскага народа? Справа рэспубліканскай Іспаніі стала нашаю кроўнаю справай. У гэтым, я кажу зноў, тоіцца і сіла паэмы «Крывёю сэрца», напісанай пра тое, што хвалюе нас сягоння, як самае блізкае і роднае.

Але па-рознаму можна напісаць і пра самае дарагое. Алесь Жаўрук напісаў паэму гарачым, усхваляваным сэрцам, як можна сказаць, дапасоўваючы да аўтара назву паэмы «Крывёю сэрца».

Вялікая сіла пачуцця, з якою напісана паэма, дала аўтару магчымасць знайсці вельмі скупыя, але і вельмі яркія сродкі выражэння.

Вось сюжэт гэтай паэмы.

Год пяць таму назад пад Овіеда ў часе абвалу шахты быў забіты рабочы Н'ета. Яго старэйшая дачка Франя, забраўшы двух малых братоў, ідзе ў свет шукаць хлеба. Ёй пашанцавала, і яна трапляе ў Мадрыдзе на работу да мадысткі. Мінае некалькі год. Фашысты ўзнімаюць мяцеж. Самалёты італьянскіх і германскіх інтэрвентаў бомбяць Мадрыд. У часе гэтага нападу забіты маленькі брат Франсіскі. Большы брат Луіс ідзе ў рэспубліканскае войска. Туды-ж ідзе і каханы Франсіскі, матрос Хозэ. З ім накіроўваецца на фронт і дзяўчына. Яна разам змагаецца за свабоду Іспаніі. Аднойчы з кулямётам яны прыкрываюць адыход рэспубліканскай часці на другія пазіцыі. І пад гэты час забіваюць Хозэ. Францыска застаецца ля кулямёта адна. Канчаюцца патроны. Мяцежнікі насядаюць усё больш і больш. У Франі ёсць у браўнінгу восем куль, з якіх яна вырашае паслаць сем куль бандытам, а восьмую — сабе.

Сітуацыя, якую мы не аднойчы сустракалі ўжо ў нашых творах пра грамадзянскую вайну. Але Жаўрук у гэтае традыцыйнае палажэнне ўносіць змену. Калі Франя пабачыла агіднага нямецкага афіцэра, яна вокамгненна прымае новае рашэнне: забівае афіцэра, а сама кідаецца на варожыя штыхі. Але бандыты забіраюць Францыску жывую, доўга катуюць яе, вымагаючы вестак аб рэспубліканскім войску. Перад вачамі Франі жыве зубчастая сцяна Крэмля: мужнай іспанскай дзяўчыне ўяўляецца, што ёй паціскае руку **той**, «хто ад мук прывёў да светлых дзён», слёзы шчасця набягаюць на вочы і Франя памірае з словамі на вуснах: «Далорэс» і «Масква».

Гэты сюжэт у паэме заключан у своеасаблівыя лірычныя рамкі — уступ і заключэнне, дзе на фоне нашай магутнай і велічнай радзімы, на фоне яе багатага і каларытнага паўднёвага пейзажа адбываецца сустрэча аўтара з іспанскім байцом Барталамео Гільярдо, які расказаў паэту пра змаганне і смерць Францыскі.

Я пераказаў так падрабязна змест паэмы для таго, каб паказаць, як шмат падзей у параўнальна малую памерам паэму здолеў змясціць аўтар. У выніку паэма выйшла надзвычай дынамічнаю. Гэта не апісанне змагання, а сама жывая і поўнакроўная барацьба, поўная руху і дынамікі. Як прыклад гэтай дынамічнасці можна назваць момант смерці кулямётчыка Хозэ, дзе аўтар паказвае, як:

> Смерць губы смаглыя сквавала,
> І толькі па дрыжэнню іх
> Дзяўчына з жахам прачытала:
> — «Цяпер змагайся за дваіх»;

і як пасля гэтага:

> Проставалосая,
> Худая,
> Яна не чуе даўніх ран, —
> Да кулямёта прыпадае
> Сухой шчакой:
> — «Но пасаран!
> Віва рэспубліка! —
> і градам
> Свінцовым стрэты ланцугі...
> — Віва рэспубліка!» —
> і радам
> Адзін кладзецца за другім.

Альбо вось яшчэ прыклад дынамічнасці, дынамічнасці другога ладу, дзе шпарка-зменлівыя падзеі, здаецца, цягнуцца цэлую вечнасць. Гэта малюнак катаванняў Франі.

> Яны пра полк яе пыталі —
> Яна маўчала —
> ёй тады
> Круцілі рукі, жылы рвалі,
> Давалі піць, зноў катавалі,
> І зноў падносілі ваду...

Тут толькі пяць радкоў, і працягласць гэтых мук дасягаецца праз скупыя, але ўдалыя паўторы і градацыю слоў.

Наогул, скупасць у сродках выражэння, максімальная сціславасць, адсутнасць доўгіх разваг і лішніх слоў — характарызуюць стыль гэтае паэмы Алеся Жаўрука. Возьмем хоць-бы самы пачатак паэмы, уступ да яе. Як мала там слоў, і як багата сказана, які свежы і яркі малюнак паўстае перад чытачом!

Як-жа гэта сталася, што тыя рысы (мноства падзей, скупыя апісанні і інш.), якія часта характарызуюць схематызм у паэзіі, у паэме Алеся Жаўрука сталі рысамі дадатнымі? У чым тут разгадка?

Нельга сказаць, што паэма вызначаецца высокамайстэрскім, адточаным вершам, ці незвычайнай, арыгінальнай метафарычнасцю, вобразнасцю мовы. Не, яна напісана вельмі проста, хоць у ёй сустракаюцца, і вельмі часта, досыць свежыя і досыць удалыя і метафары і параўнанні. Скажам, гаворачы аб памяшканні, у якім пасялілася Франя, паэт знаходзіць вельмі трапныя для гэтага выразы:

> Дзесь пад страхой, на сёмым небе
> Адгарадзілі ёй куток.

Гэтая метафара ўзята непасрэдна і вельмі дарэчы з жывой народнай мовы. Алесь Жаўрук стварае і сам не менш удалыя і трапныя параўнанні.

> Плылі
> На ветразях лагодных яхты,
> Як лебядзіны цуг вясной...

Вобраз свежы і яркі. Аднак там, дзе Жаўрук ставіць метафару як самамэту, выходзіць часта надумана і дрэнна. Скажам, у наступнай страфе:

> Матрос маўчаў. Застылі меддзю
> Нацятых сківаў жаўлакі,
> І толькі часам ўздрыгваў ледзьве
> Пергамент жоўтае шчакі, —

вельмі шмат нагрувашчана слоў, але параўнанне шчакі і сківаў з пергаментам і меддзю — узаемна выключаюць адно другое, і ў выніку твар матроса расплываецца перад намі ў невыразную пляму.

Значыць, кажу зноў, не ў фармальных дасягненнях тоіцца чароўнасць паэмы Алеся Жаўрука. У чым-жа? Мне здаецца, у тым, што ўсю сваю ўвагу ў гэтай паэме Алесь Жаўрук аддаў не вонкаваму, а ўнутранаму свету героя. Вонкавыя паводзіны і партрэты людзей служаць толькі сродкам для выражэння багатага ўнутранага іхняга свету. Адпраўным пунктам для паэта з'яўляюцца перажыванні героя. І правільна перадаючы псіхалагічны рысунак, рысунак чалавечых перажыванняў, Алесь Жаўрук правільна перадае нам паводзіны людзей, іхнія жэсты і рухі.

Возьмем за прыклад хоць-бы той самы малюнак, які я падаваў ужо, дзе памірае Хозэ і каля кулямёта застаецца адна Францыска. Тут няма ні меладраматычных слоў, ні слязлівага развітання. Тут аўтар гаворыць вельмі проста і сурова, так як гэта бывае ў жыцці:

> Смерць губы смаглыя сквавала,
> І толькі па дрыжэнню іх
> Дзяўчына з жахам прачытала:
> — «Цяпер змагайся за дваіх!».

І Францыска ў адказ не клянецца над трупам каханага высокімі словамі змагацца за свабоду, а дзейнічае, суровая і мужная:

> І вось, бляднеючы, Францыска
> Крычыць праз гул сама сабе:
> — «Цяпер, мадрыдская мадыстка,
> Усе надзеі на цябе!».

І далей ідуць радкі («проставалосая, худая» і г. д.), якія я прыводзіў ужо. Увесь гэты малюнак напісан з вялікім тэмпераментам і праўдзіва. Іначай дзейнічаць і гаварыць у гэтых абставінах Францыска не магла. Кожнае лішняе слова і кожны лішні рух гучалі-б фальшыва. Паэт пранікнуўся думкамі і перажываннямі дзяўчыны і правільна паказаў нам яе паводзіны.

Возьмем яшчэ адзін прыклад.

> Але канец апошняй ленце,
> І моўкне верны кулямёт.
> І пустата, як ноч, глухая,
> І жудасная цішыня
> Францыску раптам абступае
> З усіх бакоў.
> Глядзіць яна:
> Патроны выйшлі ўсе дашчэнту,
> Пустыя гільзы на шляху,
> Яшчэ-б адну, здаецца, ленту,
> Адну-б кароткую чаргу.

І зноў-такі малюнак напісан вельмі праўдзіва. У часе бою ўсёю істотаю аддадзеная справе дзяўчына не думае ні аб чым, нічога іншага не бачыць, апрача ворагаў. І толькі калі замаўкае кулямёт, калі з усіх бакоў абступае нечаканая цішыня, яна заўважае, нібы ачнуўшыся ад сну, што патроны скончыліся. І ўжо цяпер з'яўляецца ўпартая, адзіная думка:

> Яшчэ-б адну, здаецца, ленту,
> Адну-б кароткую чаргу.

Гэтак-жа правільна Алесь Жаўрук малюе і непрытомнасць Францыскі:

> А потым знікла ўсё кудысьці,
> Усё правалілася ў муць.
> Адно запомнілася: ў высі
> Хмурынкі лёгкія плывуць.
> Адно здалося: кулямёты
> Сустрэлі ворага з гары.
> І больш ніякія турботы
> Не хвалявалі...

Як гэта трапна сказана :«і больш ніякія турботы не хвалявалі». Сапраўды, далейшыя думкі Франі, ці хутчэй уяўныя адчуванні — ўжо не турботы, а лагодныя, светлыя сны: перад ёю плыве Крэмлёўская зубчастая сцяна, ёй здаецца, што яна бачыць, як ёй паціскае руку той, хто «ад мук прывёў да светлых дзён»... Францыска не мае ўжо ніякіх жаданняў, ніякай волі,—

> І слёзы шчасця падступаюць
> К вачам. Няхай яны цякуць.
> Няхай гараць! Цярпела? Годзе!
> Ты іх спыні цяпер вазьмі!—
> Па ўсіх дарогах свету пройдзе
> Дзяўчына з гэтымі слязьмі.
> Ёй гэтак лёгка...

Для правільнай перадачы псіхалагічнага рысунку Алесю Жаўруку патрэбны былі ўдалыя і трапныя дэталі. Ён іх знайшоў. Гэта відаць ужо з паданых мною прыкладаў і гэта можна сцвердзіць яшчэ радам новых прыкладаў.

Вось Алесь Жаўрук расказвае нам пра сваю сустрэчу з іспанскім байцом Барталамео Гільярдо. Прыгледзьцеся, якія там канкрэтныя і яркія дэталі, колькі там шырыні і непасрэднасці. І шум хваль, і прахладны брыз, і грукат кранаў, і песні васьмікласніц— усё гэта стварае шырокі фон, пейзаж нашай краіны. На гэтым фоне ярка вырысоўваецца партрэт жывога, дужага матроса, які жвава і лёгка ўзбягае на прыгорак, аглядае ўвесь гэты пейзаж і прагна дыхае «паветрам нашае зямлі».

Не менш яркімі і каларытнымі мазкамі напісан і партрэт бацькі Франі, шахцёра Н'ета:

> Суровы, не любіўшы кветак
> Шахцёр, ўдавец другое лета,
> Калісьці зух і весяльчак.

Гэтыя скупыя дэталі малююць нам не толькі застыглы вобраз чалавека, але і яго пакутнае жыццё, у выніку якога колішні «зух і весяльчак» стаў удаўцом, суровым шахцёрам. У трох кароткіх радках, трыма дэталямі паказана гісторыя чалавека.

Не магу не прывесці яшчэ аднаго прыкладу, дзе адна дэталь, адзін эпітэт адразу робіць жывым, наглядным вобраз героя. Гаворачы аб тым, як Францыска пайшла ў свет шукаць работы, Алесь Жаўрук зазначае:

> І лівень сек, і вецер золкі!
> Расхрыстваў **бацькаўскі** пінжак...

Эпітэт «бацькаўскі», гэты маленькі штрых, да апошніх граніц канкрэтызуе вобраз Францыскі. Дарогаю перад намі ідзе ўжо з клункам і вядром не абстрактная дзяўчына, а невысокая Францыска, у бацькоўскім, вялікім для яе пінжаку. Адна дэталь раскрыла перад намі вонкавы вобраз гэтай дзяўчыны.

У Жаўрука часамі, у некаторых малюнках, дэталі з'яўляюцца простым пералічэннем навакольных рэчаў і з'яў,

> ... Гурбою вучні йшлі з заняткаў
> З лемантарамі ў руках,
> Малых дзяцей купалі маткі
> У эмаліраваных тазах.
> Спавітыя ў платанаў зелень,
> У вэлюм даўняй цішыні,
> Краіны лепшыя музеі —
> Славутай гонар старыны—
> Узнёсшы лёгка к высям светлым
> Уступы строгіх стромкіх веж,
> Бялелі мірна. Вецер ветлы
> Шасцеў між сонных лоз-мярэж...
> І раптам —
> Выбух нечуваны,
> У шматкі парваўшы цішыню,
> Як пяруном тым гураганным
> Усё аглушыў і ўсхамянуў.

Як бачым, зарысоўка вельмі простая, тут нічога няма незвычайнага, але з'явы і рэчы так падабраны і так скампанаваны, што ў выніку малюнак выходзіць жывы і каларытны.

Тут, апрача ўсяго іншага, выступае яшчэ адна якасць паэмы. У жывапісцаў ёсць такое паняцце: святло і цень. Алесь Жаўрук у сваёй паэме ўмела і ўдала выкарыстоўвае гэты прыём жывапісу. Пералічаючы з'явы і рэчы, паэт бярэ іх з розных радоў і ў розных планах, у выніку — святло падкрэслівае цень і наадварот. Так, напрыклад, малюючы, як «над дахам хмары беглі нізка» і як «ціш спавіла асфальт Алкала», паэт нечанака рэзка мяняе тон і канчае страфу такімі радкамі:

> І толькі недзе там, над ім,
> Па стрэхах бляха скрыгатала
> Галодным скрогатам сваім.

І так у Жаўрука амаль усюды— увесь малюнак ён піша адною фарбаю і абавязкова адценьвае яго іншаю: цішыню горада і спакойны плаўны рух хмар, у дадзеным выпадку, адценьвае рэзкім, «галодным» скрогатам бляхі. Тое-ж самае ў больш разгорнутым выглядзе мы бачым і ў малюнку, пададзеным вышэй. Спакойна ідуць вучні з заняткаў, маткі купаюць дзяцей, мірна бялеюць музеі, узнёсшы лёгка свае вежы, — усё гэта напісана ў адным тоне і адною светлаю фарбаю. І раптам — рэзкі, цёмны мазок: нечуваны выбух. Тут, развіваючы шырокі пейзажны малюнак, Алесь Жаўрук пашырае свой прыём падкрэслівання святла ценем аж да поўнага кантрасту. У іншых месцах гэты прыём не так кідаецца ў вочы, але ён характэрны для ўсяе паэмы «Крывёю сэрца».

Нельга не адзначыць некаторых асабліва няўдалых месц гэтай удалай у цэлым і цікавай паэмы Алеся Жаўрука. Так, напрыклад, заблытана і неахайна напісана лірычнае адступленне паэта, у якім ён звяртаецца да сваёй радзімы («Зямля мая, з багны і глуму, ты ўстала людзям, як маяк...» і г. д.) Тут апрача стылістычнай неахайнасці сам верш надзвычай немілагучны, няма ў ім той шырыні і плаўнасці, якая ёсць у лепшых месцах паэмы. Наогул, мілагучнасць верша ў Алеся Жаўрука часта траціцца ад нагрувашчання цяжкіх для вымаўлення слоў, ад частага збегу зычных, ад ужывання на пачатку сказаў, пасля знакаў прыпынку і пасля цвёрдых зычных — «ў» кароткага. Багата ў Алеся Жаўрука цяжкіх і непрыемных інверсій (накшталт: «басконскіх гонар футбалістаў», «славутай гонар старыны»), таксама як і асобных слоў («бурлячае мора», «згойсаная трава») і няправільных зваротаў (напрыклад, пайсці «за запалкамі» замест «па запалкі»).

Я не спыняюся падрабязна на ўсіх недахопах паэмы і на яе іншых асаблівасцях, зазначыўшы толькі на той метад і на тыя найбольш яркія сродкі выражэння, з дапамогаю якіх Алесь Жаўрук перадае нам карціну жыцця, змагання і смерці звычайнай і простай іспанскай дзяўчыны. Узяўшы за адыходны пункт лёс чалавека, яго ўнутраны свет, яго думкі і перажыванні, паэт праўдзіва і рэалістычна напісаў і вонкавы партрэт героя і праўдзіва паказаў яго паводзіны і трыманне. Глыбокае пранікненне ў душу героя, у сэрца падзей, звязаных з ім, дапамагло аўтару вынайсці і адпаведныя сродкі для напісання карціны. Не халодная развага майстра, а гарачае пачуццё мастака, тая ўсхваляванасць, з якою напісана паэма «Крывёю сэрца», падказалі Жаўруку і каларытны пейзаж, і яркую дэталь, і дынамічны рытм, і кампазіцыю рэчы.

Пятро ГЛЕБКА.

(Канец будзе).

ПРАЦЭС АНТЫСОВЕЦКАГА „ПРАВА-ТРАЦКІСЦКАГА БЛОКА“

АБВІНАВАЎЧАЕ ЗАКЛЮЧЭННЕ

ПА СПРАВЕ Бухарына Н. І., Рыкава А. І., Ягоды Г. Г., Крэсцінскага Н. Н., Ракоўскага Х. Г., Розенгольца А. П., Іванова В. І., Чэрнова М. А., Грынько Г. Ф., Зеленскага І. А., Бессонава С. А., Ікрамава А., Хаджаева Ф., Шаранговіча В. Ф., Зубарэва П. Т., Буланава П. П., Левіна Л. Г., Плетнёва Д. Д., Казакова І. Н., Максімава-Дзікоўскага В. А. і Кручкова П. П.—

абвінавачваемых у тым, што яны па заданню разведак варожых да Совецкага Саюза замежных дзяржаў склалі змоўніцкую групу пад назвай „права-трацкісцкі блок“, паставіўшую сваёй мэтаю шпіянаж у карысць замежных дзяржаў, шкодніцтва, дыверсіі, тэрор, падрыў ваеннай магутнасці СССР, правакацыю ваеннага нападу гэтых дзяржаў на СССР, разчляненне СССР і адрыў ад яго Украіны, Беларусі, Сярэдне-Азіяцкіх Рэспублік, Грузіі, Арменіі, Азербайджана, Прымор'я на Далёкім Усходзе—у карысць памянёных замежных дзяржаў, нарэшце, звяржэнне ў СССР існуючага соцыялістычнага грамадскага і дзяржаўнага ладу і аднаўленне капіталізма, аднаўленне ўлады буржуазіі.

Праведзеным органамі НКВД расследаваннем устаноўлена, што па заданню разведак варожых да СССР замежных дзяржаў. абвінавачваемыя па гэтай справе арганізавалі змоўніцкую групу пад назвай «права-трацкісцкі блок», паставіўшую сваёй мэтай звяржэнне існуючага ў СССР сопыялістычнага грамадскага і дзяржаўнага ладу, аднаўленне ў СССР капіталізма і ўлады буржуазіі, расчляненне СССР і адтаржэнне ад яго ў карысць указаных вышэй дзяржаў Украіны, Беларусі, Сярэдне-Азіяцкіх рэспублік, Грузіі, Арменіі, Азербайджана і Прымор'я.

Следствам устаноўлена, што «права-трацкісцкі блок» яднаў у сваіх радах падпольныя антысовецкія групы трацкістаў, правых, зіноўеўцаў, меншавікоў, эсэраў, буржуазных нацыяналістаў Украіны, Беларусі, Грузіі, Арменіі, Азербайджана, Сярэдне-Азіяцкіх рэспублік, што пацвярджаецца матэрыяламі не толькі гэтага следства, але і матэрыямі судовых працэсаў, прайшоўшых у розных месцах у СССР, і, у прыватнасці, судовых працэсаў па справе групы ваенных змоўшчыкаў—**Тухачэўскага** і іншых, асуджаных Спецыяльным Прысутвам Вярхоўнага Суда СССР 11 чэрвеня 1937 года, і па справе групы грузінскіх буржуазных нацыяналістаў **Мдзівані, Окуджава** і інш., асуджаных Вярхоўным судом Грузінскай ССР 9 ліпеня 1937 года.

Пазбаўленыя ўсякай апоры ўнутры СССР, удзельнікі «права-трацкісцкага блока» ўсе свае надзеі ў барацьбе супроць існуючага ў СССР грамадскага і дзяржаўнага соцыялістычнага ладу і за захват улады ўскладалі выключна на ўзброеную дапамогу замежных агрэсараў, якія абяцалі аказаць змоўшчыкам гэту дапамогу на ўмовах расчлянення СССР і адтаржэння ад СССР Украіны, Прымор'я, Беларусі, Сярэдне-Азіяцкіх рэспублік, Грузіі, Арменіі і Азербайджана.

Такое пагадненне «права-трацкісцкага блока» з прадстаўнікамі ўказаных вышэй замежных дзяржаў палягчалася тым, што многія кіруючыя ўдзельнікі гэтай змовы з'ўляліся даўнішнімі агентамі замежных разведак, ажыццяўляўшымі на працягу многіх гадоў шпіёнскую дзейнасць у карысць гэтых разведак.

Гэта перш за ўсё адносіцца да аднаго з натхніцеляў змовы — ворага народа **Троцкага.** Яго сувязь з Гестапо была вычарпальна даказана на працэсах трацкісцка-зіноўеўскага тэрарыстычнага цэнтра ў жніўні 1936 года і антысовецкага трацкісцкага цэнтра ў студзені 1937 года.

Аднак, матэрыялы па гэтай справе, якія ёсць у распараджэнні следства, устанаўляюць, што сувязь ворага народа **Троцкага** з нямецкай палітычнай паліцыяй і разведкамі іншых краін адносіцца да значна больш ранняга перыяда часу. Следствам дакладна ўстаноўлена, што **Троцкі** быў звязан з германскай разведкай ужо з 1921 года і з англійскай «Інтэліжэнс-Сервіс» з 1926 года.

Што датычыць прыцягнутых па гэтай справе, то значная частка гэтых абвінавачваемых, па іх уласнаму прызнанню, з'ўляюцца шпіёнамі — агентамі замежных разведак ужо доўгі час.

Так, абвінавачваемы **Крэсцінскі Н. Н.** па прамому заданню ворага народа **Троцкага** ўступіў у здрадніцкую сувязь з германскай разведкай у 1921 годзе.

Абвінавачваемы **Розенгольц А. П.** — адзін з кіраўнікоў трацкісцкага падполля, пачаў сваю шпіёнскую работу для германскага генеральнага штаба ў 1923 годзе, а для англійскай разведкі ў 1926 годзе.

Абвінавачваемы **Ракоўскі Х. Г.** — адзін з бліжэйшых і асоба даверанных людзей **Л. Троцкага,** з'ўляўся агентам англійскай «Інтэліжэнс-Сервіс» з 1924 года і японскай разведкі з 1934 года.

Абвінавачваемы **Чэрноў М. А.** пачаў сваю шпіёнскую работу ў карысць Германіі ў 1928 годзе, звязаўшыся з германскай разведкай па ініцыятыве і пры садзейнасці небезвядомага эмігранта-меншавіка **Дана.**

Абвінавачваемы **Шаранговіч В. Ф.** быў завербаван і перакінут польскай разведкай для шпіёнскай работы ў СССР у 1921 годзе.

Абвінавачваемы **Грынько Г. Ф.** стаў шпіёнам германскай і польскай разведак у 1932 годзе.

Кіраўнікі «права-трацкісцкага блока», у тым ліку абвінавачваемыя па гэтай справе **Рыкаў, Бухарын** і іншыя, былі поўнасцю асвядомлены аб шпіёнскіх сувязях сваіх саўдзельнікаў і ўсяляк заахвочвалі расшырэнне гэтых шпіёнскіх сувязей.

Усё гэта дастаткова тлумачыць, чаму гэтыя паны, якія знаходзіліся на службе замежных разведак, з такой лёгкасцю ішлі на расчляненне СССР і адтаржэнне цэлых абласцей і рэспублік у карысць замежных дзяржаў.

Згода «права-трацкісцкага блока» з замежнымі разведкамі таксама палягчалася і тым, што некаторыя з абвінавачваемых па гэтай справе змоўшчыкаў з'ўляліся правакатарамі і агентамі царскай ахранкі.

Прабраўшыся на адказныя пасты ў совецкай дзяржаве, гэтыя правакатары, аднак, не пераставалі апасацца выкрыцця сваіх злачынстваў супроць рабочага класа, супроць справы соцыялізма. Ахопленыя пастаянным страхам свайго выкрыцця, гэтыя ўдзельнікі змовы бачылі сваё адзінае выратаванне ў звяржэнні совецкай улады, ліквідацыі совецкага ладу, аднаўленні ўлады памешчыкаў і капіталістаў, у інтарэсах якіх яны прадаваліся царскай ахранцы і пры якой яны толькі і маглі адчуваць сябе па-за небяспекай.

Так, абвінавачваемы **Зеленскі І. А.** з'ўляўся агентам самарскага жандарскага ўпраўлення з 1911 года. З таго часу **Зеленскі** пад клічкамі «Очкасты» і «Салаф» сістэматычна інфармаваў жандарскае ўпраўленне аб дзейнасці самарскай арганізацыі большэвікоў, атрымліваючы за гэта рэгулярную штомесячную грашовую ўзнагароду.

Абвінавачваемы **Іваноў** сваю правакатарскую дзейнасць пачаў з 1911 года, калі быў завербаван тульскай ахранкай і стаў агентам ахранкі пад клічкай «Самарын».

Абвінавачваемы **Зубарэў** быў завербаван царскай паліцыяй у 1908 годзе і супрацоўнічаў у ёй пад клічкамі «Васілій», «Палін» і «Прохар».

Як устаноўлена следствам, для дасягнення сваіх злачынных мэтаў па звяржэнню совецкага ўрада, захвату ўлады і аднаўленню капіталізма ў СССР змоўшчыкі, па прамых указаннях замежных разведак, вялі шырокую шпіёнскую работу ў карысць гэтых разведак, арганізоўвалі і ажыццяўлялі шкодніцкія і дыверсійныя акты ў мэтах забеспячэння паражэння СССР у надыходзячым нападзе на СССР фашысцкіх агрэсараў, усяляк правакавалі паскарэнне гэтага нападу фашысцкіх агрэсараў, а таксама арганізавалі і ажыццявілі рад тэрарыстычных актаў супроць кіраўнікоў партыі, урада і выдаючыхся совецкіх дзеячоў.

І. ШПІЯНАЖ СУПРОЦЬ СОВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАВЫ І ЗДРАДА РАДЗІМЕ

Следствам устаноўлена, што большасць главароў «права-трацкісцкага блока», абвінавачваемых па гэтай справе, ажыццяўляла сваю злачынную дзейнасць па прамому ўказанню **Троцкага** і па планах, шырока задуманых і распрацаваных у генеральных штабах некаторых замежных дзяржаў.

Агент германскай разведкі — відны трацкіст абвінавачваемы **Крэсцінскі,** на допыце ў Пракуратуры Саюза ССР 2 снежня 1937 года заявіў:

«На шпіёнскую сувязь з немцамі я пайшоў па прамому заданню **Троцкага,** які даручыў мне пачаць па гэтаму повату перагаворы з генералам **Сектам...»**

(Т. 3, л. с. 102).

Закранаючы абставіны ўстанаўлення сувязей трацкісцкай арганізацыі з нямецкай разведкай, абвінавачваемы **Крэсцінскі** паказаў, што ён зімой 1921 года вёў з камандуючым германскім рэйхсверам генералам **Сектам** перагаворы аб атрыманні ад рэйхсвера грашовых сродкаў для вядзення трацкісцкай падпольнай работы ўзамен прадастаўлення трацкістамі нямецкай разведцы шпіёнскіх матэрыялаў.

Абвінавачваемы **Крэсцінскі** па гэтаму поваду паказаў:

«...**Троцкі** даручыў мне па прыездзе ў Берлін завязаць па гэтаму пытанню перагаворы з генералам **Сектам.** Гэту дырэктыву **Троцкага** я выканаў...»

(Т. 3, л. с. 14 об.).

Абвінавачваемы **Крэсцінскі,** гаворачы далей аб сваёй і сваіх саўдзельнікаў здрадніцкай дзейнасці, паказаў:

«З генераламі **Сектам і Хассе** мы дагаварыліся аб тым, што будзем садзейнічаць рэйхсверу ў стварэнні на тэрыторыі СССР раду апорных разведчых пунктаў шляхам бесперашкоднага пропуску камандзіруемых рэйхсверам разведчыкаў і што мы будзем забяспечваць рэйхсвер разведчымі матэрыяламі, г. зн. па-просту гаворачы, будзем нямецкімі шпіёнамі. За гэта рэйхсвер абавязаўся штогод выплачваць 250.000 марак у выглядзе субсідыі на контррэволюцыйную трацкісцкую работу...»

(Т. 3, л. с. 102).

«Выплата грашовых субсідый рабілася рэгулярна, часткамі, некалькі разоў у год, галоўным чынам, у Маскве і зрэдку ў Берліне...

У Берліне гэтыя грошы, калі іх па тых ці іншых прычынах не выплачвалі ў Маскве, атрымліваў я непасрэдна ад **Секта,** звычайна адвозіў у Маскву сам і перадаваў **Троцкаму».**

(Т. 3, л. с. 15).

Другі відны трацкіст, адзін з кіраўнікоў антысовецкага трацкісцкага падполля і актыўны ўдзельнік змовы абвінавачваемы **Розенгольц,** выкрыты ў шпіянажы, пацвердзіўшы на следстве факт згоды **Троцкага** з рэйхсверам, паказаў:

«Мая шпіёнская дзейнасць пачалася яшчэ ў 1923 годзе, калі па дырэктыве **Троцкага** я перадаў рад сакрэтных даных камандуючаму рэйхсверам **Секту** і начальніку нямецкага генштаба **Хассе.** У далейшым са мной непасрэдна звязаўся . . . . . пасол у СССР п. №, якому я перыядычна перадаваў весткі шпіёнскага характару. Пасля ад'езду п. №, я працягваў шпіёнскую сувязь з новым паслом п. №».

(Т. 6, л. с. 131 об.).

Пасля фашысцкага перавароту ў Германіі шпіёнская работа трацкістаў прыняла яшчэ больш шырокі і рэзка выражаны паражэнчы характар.

Абвінавачваемы **Бессонаў,** які, па яго ўласнаму прызнанню, прымаў актыўны ўдзел у нелегальных перагаворах трацкістаў з германскімі фашысцкімі, пераважна, ваеннымі коламі аб сумеснай барацьбе супроць СССР, не толькі асабіста вёў перагаворы аб падтрыманні антысовецкай змовы з бліжэйшым супрацоўнікам **Розенберга** па знешнепалітычнаму аддзелу фашысцкай партыі **Дайцам,** але і быў у курсе сустрэч і перагавораў **Л. Троцкага з Гесам, Нідэрмаерам** і праф. **Хаусхаверам,** з якім **Л. Троцкі** дасягнуў згоды на ўмовах, аб якіх гаварыў **Пятакоў** на судовым працэсе па справе антысовецкага трацкісцкага цэнтра.

Абвінавачваемы **Бессонаў** паказаў, што:

«...Як відаць з гэтых умоў..., цэнтр цяжару падпольнай работы трацкістаў перанасіўся на падрыўныя шпіёнскія, дыверсійныя і тэрарыстычныя акты ўнутры СССР».

(Т. 11, л. с. 106).

Наяўнасць згоды **Л. Троцкага** і трацкісцкай арганізацыі ў СССР з фашысцкімі коламі і правядзенне ў СССР падрыўной паражэнчай работы па ўказаннях германскай разведкі прызналі на следстве і іншыя абвінавачваемыя па гэтай справе.

Аднак, сувязямі з германскім фашызмам паражэнчая работа трацкісцкіх наймітаў не абмяжоўвалася. Яны разам з іншымі ўдзельнікамі антысовецкай змовы, у адпаведнасці з лініяй **Л. Троцкага,** арыентаваліся і на другога фашысцкага агрэсара — Японію.

Фактычны бок здрадніцкіх адносін антысовецкіх змоўшчыкаў з японскай разведкай прадстаўляецца па матэрыялах следства ў такім выглядзе:

Як паказаў абвінавачваемы **Крэсцінскі,** у часе спаткання з **Л. Троцкім** у Меране, у кастрычніку 1933 года, **Троцкі** яму заявіў аб неабходнасці ўстанаўлення больш цеснай сувязі з японскай разведкай.

Гэта ўказанне **Троцкага** было **Крэсцінскім** перадана **Пятакову** і іншым главарам змовы, якія праз абвінавачваемага **Ракоўскага** і іншых удзельнікаў змовы ўвайшлі ў здрадніцкія зносіны з прадстаўнікамі Японіі, абавязаўшыміся аказаць змове узброеную дапамогу ў звяржэнні совецкай улады, узамен чаго змоўшчыкі абяцалі аддаць Японіі совецкае Прымор'е.

Як устаноўлена следствам, абвінавачваемы **Ракоўскі** ў сувязі з яго прабываннем у Японіі летам 1934 года атрымаў ад **Пятакова** ўказанне аб тым, што —

«...Трэба ўзмацніць адначасова і знешнюю дзейнасць у сэнсе кантакта з варожымі СССР урадамі... Трэба паспрабаваць скарыстаць паездку ў Токіо і, што магчыма, ... прадпрыме неабходныя крокі ў гэтым напрамку».

(Т. 4, л. с. 194).

Гэта даручэнне абвінавачваемы **Ракоўскі** выканаў, і, знаходзячыся ў Токіо, сапраўды ўстанавіў злачынную сувязь з . . . . . коламі.

Па гэтаму поваду абвінавачваемы **Ракоўскі** паказаў:

«Усе гэтыя акалічнасці мелі сваім лагічным і практычным вынікам той факт, што я стаў з часу майго прабывання ў Токіо прамым агентам-шпіёнам . . . . ., будучы завербаван для гэтай мэты, па даручэнню . . . . . урада, п. №, найбольш уплывовым палітычным дзеячом капіталістычна-феадальнай Японіі і адным з буйнейшых яе плутакратаў».

(Т. 4, л. с. 186).

Той-жа абвінавачваемы **Ракоўскі,** гаворачы аб сувязі ворага народа **Л. Троцкага** з англійскай разведкай, паказаў:

«**Троцкі,** як мне было вядома, з'ўляўся агентам «Інтэліжэнс-Сервіс» з канца 1926 года. Аб гэтым мне паведаміў сам **Троцкі».**

(Т. 4, л. с. 363).

Уваходзіўшыя ў склад «права-трацкісцкага блока» групы буржуазных нацыяналістаў таксама былі цяснейшым чынам звязаны з замежнымі разведкамі.

Так, абвінавачваемы **Грынько,** які з'ўляўся агентам нямецкай і польскай разведак, закранаючы антысовецкую дзейнасць украінскай нацыянал-фашысцкай арганізацыі, адным з кіраўнікоў якой ён з'ўляўся, паказаў:

«...К 1930 году адносіцца абмеркаванне ў нашай арганізацыі пытання аб неабходнасці дагаварыцца з Польшчай аб аказанні ваеннай дапамогі паўстанчаму выступленню на Украіне супроць совецкай улады. У рэзультаце гэтых перагавораў з Польшчай было дасягнута пагадненне, і польскі генеральны штаб узмацніў перакідку на Украіну зброі, дыверсантаў і петлюраўскіх эмісараў».

(Т. 9, л. с. 18).

І далей:

«У канцы 1932 года я, на глебе маёй нацыяналістычнай работы, уступіў у здрадніцкую сувязь з п. №. Мы сустракаліся з ім у маім службовым кабінеце, куды п. № з'ўляўся па справах германскай канцэсіі».

«У другой палове 1933 года п. № мне прама сказаў, што германскія фашысты хочуць супрацоўнічаць з украінскімі нацыяналістамі па украінскаму пытанню. Я адказаў п. № згодай на супрацоўніцтва. У далейшым, на працягу 1933—1934 гг. у мяне было некалькі сустрэч з п. №., а перад яго ад'ездам з СССР ён звязаў мяне з п. №. з якім я працягваў свае здрадніцкія зносіны».

(Т. 9, л. с. 286 об.).

Другі ўдзельнік антысовецкай змовы і адзін з кіраўнікоў нацыяналістычнай арганізацыі ва Узбекістане абвінавачваемы **Ікрамаў** паказаў:

«Перад намі пастаянна ўзнікала пытанне аб неабходнасці арыентавацца на адну з моцных еўрапейскіх дзяржаў, якая аказала-б нам непасрэдную дапамогу ў момант узброенай барацьбы супроць совецкай улады...»

(Т. 12, л. с. 59, 60).

«... Некаторыя члены контррэволюцыйнай арганізацыі лічылі Англію найбольш рэальнай у справе аказання дапамогі нам, бо яна краіна магутная і зможа з дастатковай сілай падтрымаць нас у момант непасрэднай узброенай барацьбы»...

(Т. 12, л. с. 60).

Абвінавачваемы **Шаранговіч,** агент польскай разведкі і адзін з кіраўнікоў антысовецкай арганізацыі беларускіх нацыянал-фашыстаў, прызнаў, што гэта арганізацыя вяла сваю падрыўную работу не толькі па ўказаннях правых і «права-трацкісцкага блока», але і па дырэктывах польскай разведкі.

Па гэтаму поваду абвінавачваемы **Шаранговіч** паказаў:

«К гэтаму перыяду (1933 г.) згладзіліся якія-небудзь рознагалоссі паміж правымі, трацкістамі і нацыянал-фашыстамі. Усе мы ставілі перад сабой адну задачу — задачу барацьбы з совецкай уладай любымі метадамі, уключаючы тэрор, дыверсію і шкодніцтва. Канечнай мэтай усіх гэтых трох арганізацый, дзейнічаўшых на тэрыторыі нацыянальнай рэспублікі, было адтаржэнне Беларусі ад Совецкага Саюза і стварэнне «незалежнай» буфернай дзяржавы, якая, несумненна, знаходзілася-б цалкам у руках Польшчы і Германіі...»

(Т. 14, л. с. 27).

і далей:

«Не гледзячы на тое, што дырэктывы, атрымліваемыя намі, зыходзілі, з аднаго боку, з Масквы, ад цэнтра правых і трацкістаў, а з другога боку, з Варшавы — ад польскіх . . . . . колаў, ніякай розніцы ў іх змесце не было, яны былі адзіны і намі ператвараліся ў жыццё».

(Т. 14, л. с. 31).

Абвінавачваемы **Рыкаў** поўнасцю пацвердзіў наяўнасць здрадніцкай сувязі правых з фашысцкай Польшчай, паказаўшы:

«... Група ўдзельнікаў арганізацыі правых, у адпаведнасці з указаннямі цэнтра правых і маімі асабістымі ўказаннямі, у мэтах ажыццяўлення нашых змоўшчыцкіх, здрадніцкіх планаў, устанавіла сувязь з фашысцкай Польшчай, з польскімі разведвальнымі органамі ў прыватнасці».

(Т. 1, л. с. 118).

Гаворачы далей аб планах адтаржэння ад СССР Беларусі, абвінавачваемы **Рыкаў** паказаў:

«Агульная формула, на якой мы тады сышліся, зводзілася да таго, што ў перагаворах з палякамі... мы пойдзем на адтаржэнне ад СССР Беларускай Совецкай Рэспублікі, на стварэнне «незалежнай» Беларусі пад пратэктаратам Польшчы...»

(Т. І, л. с. 119).

Як устаноўлена следствам, уся злачынная дзейнасць уваходзіўшай у «права-трацкісцкі блок» антысовецкай групы правых даказвае, што правыя былі такой-жа агентурай замежных генштабаў, як і іншыя ўдзельнікі гэтай змовы.

Адны з правых — непасрэдна, другія праз сваіх саўдзельнікаў таксама былі звязаны з разведкамі замежных дзяржаў, на дапамогу якіх у сваёй барацьбе супроць совецкай улады яны толькі і разлічвалі.

Абвінавачваемы **Бухарын** быў у курсе перагавораў **Л. Троцкага** з нямецкімі фашыстамі і таксама, як і **Л. Троцкі,** падрыхтоўваў паражэнне СССР і адтаржэнне ад СССР Украіны, Беларусі, Прымор'я, Грузіі, Арменіі, Азербайджана і Сярадне-Азіяцкіх рэспублік.

Гэта прызнаў поўнасцю абвінавачваемы **Бухарын,** паказаўшы наступнае:

«К таму часу, калі **Троцкі** вёў перагаворы з нямецкімі фашыстамі і абяцаў ім тэрытарыяльныя ўступкі, мы, правыя, ужо былі ў блоку з трацкістамі. **Радэк** мне гаварыў, што **Троцкі** лічыць асноўным шансам прыходу блока да ўлады паражэнне СССР у вайне з Германіяй і Японіяй і прапануе пасля гэтага паражэння аддаць Германіі Украіну, а Японіі — Далёкі Усход. **Радэк** мне паведаміў аб гэтым у 1934 годзе...»

(Т. 5, л. с. 107).

Па гэтаму поваду абвінавачваемы **Ф. Хаджаеў** на следстве паказаў:

«**Бухарын** указваў, што Узбекістан і Туркменія павінны быць адторгнуты ад СССР і існаваць пад пратэктаратам Японіі і Германіі але што пры гэтым не ўдасца абыйсці і Англію і таму трэба пайсці на завязванне сувязей з англічанамі. Рэальней ўсяго стаяла пытанне аб пратэктараце Англіі і таму ўпор быў узят на яе».

(Т. 13, л. с. 89 об.).

Паказанне абвінавачваемага **Ф. Хаджаева** знаходзіць сабе поўнае пацвярджанне і ў іншых матэрыялах следчай вытворчасці, поўнасцю выкрываючых паражэнчую лінію «права-трацкісцкага блока».

Так, абвінавачваемы **Рыкаў** па гэтаму пытанню паказаў:

«Што-ж датычыць нашай паражэнчай пазіцыі, то і яе **Бухарын** поўнасцю падзяляў і выказваўся за гэту пазіцыю яшчэ больш рэзка, чым мы. У прыватнасці, іменна ён унёс прапанову і фармуляваў ідэю адкрыцця фронта немцам у выпадку вайны».

(Т. І, л. с. 152).

Характарызуючы свае адносіны да гэтага пытання, абвінавачваемы **Рыкаў** паказаў:

«Як і іншыя члены цэнтра правых, я быў асведамлён аб здрадніцкіх перагаворах прадстаўнікоў нашай контррэволюцыйнай арганізацыі з германскімі фашыстамі, падтрымку якіх мы шукалі. Натуральна, што такая падтрымка была звязана з неабходнасцю ўступак германскім фашыстам, на што мы і ішлі».

(Т. І, л. с. 151 об.).

Такая была шпіёнская і паражэнчая работа «права-трацкісцкага блока», гэтых здраднікаў, прадаваўшых замежным разведкам совецкія дзяржаўныя тайны, гандляваўшых свабодай народаў СССР, незалежнасцю і недатыкальнасцю соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян.

Ажыццяўляючы свае злачынныя замыслы, антысовецкія змоўшчыкі, па прамых дырэктывах замежных фашысцкіх разведак, арганізавалі ў асобных рэспубліках, краях і абласцях Совецкага Саюза разгалінаваную сетку дыверсійных і шкодніцкіх гнёздаў, ахапіўшы імі рад прадпрыемстваў прамысловасці, транспарта, сельскай гаспадаркі і сістэмы тавараабароту.

Заключыўшы згоду з фашысцкімі коламі аб здрадніцкім адкрыцці арміям гэтых фашысцкіх дзяржаў нашых франтоў у часе вайны, удзельнікі права-трацкісцкай змовы рыхтавалі падрыў матэрыяльна-тэхнічнай базы Чырвонай Арміі — абароннай прамысловасці.

Радам падрыхтоўваемых імі разрушальных дыверсійных дзеянняў змоўшчыкі разлічвалі ў часе вайны ўзарваць і знішчыць рашаючыя абаронныя прадпрыемствы нашай соцыялістычнай радзімы. Яны падрыхтоўвалі таксама правядзенне крушэнняў чыгуначных воінскіх паяздоў з масавымі чалавечымі ахвярамі.

Яны ставілі сваёй задачай паралізаваць ўсё гаспадарчае жыццё краіны, харчаванне арміі і снабжэнне яе ўзбраеннем.

Следствам устаноўлена, што цэлы рад такіх дыверсійных і шкодніцкіх актаў змоўшчыкамі быў ужо праведзен у розных галінах народнай гаспадаркі.

Найміт замежных разведак, вораг народа **Троцкі,** як гэта ўстаноўлена следствам, у радзе сваіх пісем і асабістых указанняў кіруючым удзельнікам антысовецкай змовы ў СССР патрабаваў узмацнення шкодніцкай і дыверсійнай дзейнасці ўнутры Совецкага Саюза.

Кіруючы ўдзельнік змовы — абвінавачваемы **Крэсцінскі** паказаў, што яму асабіста ў 1933 годзе ў Меране **Л. Троцкі** заявіў, што:

«... яму, **Троцкаму,** будзе значна лягчэй весці перагаворы з немцамі, калі ён зможа сказаць ім, што па лініі правядзення дыверсійна-шкодніцкіх актаў і падрыхтоўкі тэрору сапраўды вядзецца сур'ёзная работа».

(Т. 3. л. с. 54—55).

Следствам устаноўлена, што рад зробленых у Далёкаўсходнім краі дыверсійных актаў быў падрыхтаван і праведзен удзельнікамі антысовецкай змовы па прамых дырэктывах японскіх разведчых органаў і ворага народа **Л. Троцкага.** Так, па дырэктыве японскай разведкі было арганізавана крушэнне таварнага поезда з воінскім грузам на ст. Валачаеўка і на перагоне Хэр-Дармідонтаўка поезда № 501, калі было забіта 21 чалавек і паранена 45 чалавек. Па тых-жа ўказаннях японцаў былі зроблены дыверсіі на шахтах № 10 і 20 у Сучане.

(Гл. т. 45, л. с. 1—14).

Аб такіх-жа дырэктывах, выходзячых ад **Л. Троцкага,** падрабязныя паказанні на следстве даў абвінавачваемы **Розенгольц,** які паказаў наступнае:

«Побач з дырэктывай **Троцкага,** атрыманай мною праз **Крэсцінскага** і **Седова,** аб правядзенні ў знешнім гандлі шкодніцкай работы, накіраванай на аказанне прамой дапамогі Германіі і Японіі, — характар маёй шкодніцкай дзейнасці вызначаўся яшчэ ўказаннямі . . . . . паслоў у СССР п. № і п. №, сувязь з якімі ў гэтых адносінах адыграла буйную ролю, так як мне прыходзілася кіравацца ў рабоце іх канкрэтнымі ўказаннямі.

Пасля ўстанаўлення кантакта з **Тухачэўскім і Рыкавым** я паведаміў першага праз **Крэсцінскага,** а апошняга асабіста аб дырэктыве **Троцкага** па шкодніцкай рабоце, і абодва яны адобрылі правядзенне мною гэтай работы.

Шкодніцтва ў знешнім гандлі ў рэзультаце ўсяго гэтага ішло, галоўным чынам, па наступных трох лініях: першае — эканамічная дапамога Германіі і Японіі за кошт СССР; другое—нанясенне эканамічнай страты і шкоды СССР; трэцяе — нанясенне палітычнай шкоды СССР».

(Т. 6, л. с. 49).

Па ўказаннях «права-трацкісцкага блока», абвінавачваемы **Шаранговіч** разгарнуў шырокае шкодніцтва ў галіне сельскай гаспадаркі і прамысловасці БССР.

Па гэтаму поваду абвінавачваемы **Шаранговіч** паказаў:

«На месцах, для практычнага ажыццяўлення нашых шкодніцкіх замыслаў, была створана сетка шкодніцкіх дыверсійных груп... Усе мы, пачынаючы з кіраўнікоў арганізацыі і канчаючы яе радавымі членамі, з'ўляліся нацыянал-фашыстамі і вялі работу супроць совецкай улады, за адрыў Беларусі ад Саюза ССР, не грэбуючы ніякімі способамі»...

(Т. 14, л. с. 40).

Абвінавачваемы **Чэрноў,** звязаны на працягу раду год з германскай разведкай у якасці яе сакрэтнага агента ў СССР, таксама актыўна скарыстаў сваё высокае службовае становішча ў СССР для арганізацыі па заданнях германскай разведкі раду дыверсійна-шкодніцкіх дзеянняў у сельскай гаспадарцы.

Германскі шпіён абвінавачваемы **Чэрноў** аб сваіх злачынных сувязях з германскім разведчыкам карэспандэнтам газеты «Берлінер тагблат» **Шэферам** і аб сваёй шкодніцкай рабоце ў галіне сельскай гаспадаркі паказаў наступнае:

«Калі я перайшоў на работу ў Камітэт Загатовак, то **Шэфер** перадаў мне заданне немцаў—праводзіць шкодніцкую дзейнасць па лініі Камітэта Загатовак, у асаблівасці ў галіне мабілізацыйных запасаў.

Заданні разведкі па шкодніцтву супадалі з указаннямі, якія я, як член арганізацыі правых, атрымліваў ад **Рыкава.** Тым з большай гатоўнасцю я прыняў іх да выканання».

(Т. 8, л. с. 98, об. 25).

Па гэтаму поваду абвінавачваемы **Чэрноў** паказаў:

«У 1934 г., сустрэўшыся з **Рыкавым** на яго дачы, я атрымаў ад яго заданне шырока разгарнуць шкодніцтва ў галіне сельскай гаспадаркі. Гэта заданне я выканаў і праводзіў шкодніцкую падрыўную дзейнасць дастаткова актыўна».

(Т. 8, л. с. 93).

Значная падрыўная шкодніцкая дзейнасць у галіне сельскай гаспадаркі ўскрыта следствам і па Узбекістану, дзе арудвалі нацыяналістычныя арганізацыі, якія блакіраваліся праз сваіх главароў абвінавачваемых **Ікрамава** і **Хаджаева** з цэнтрам антысовецкай змовы.

Адзін з кіраўнікоў гэтай нацыяналістычнай арганізацыі абвінавачваемы **Хаджаеў** Файзула паказаў:

«Мы не абмяжоўваліся толькі падрыхтоўкай кадраў для ўзброенай барацьбы з совецкай уладай, але мы ўжо зараз актыўна дзейнічалі ў мэтах падрыву магутнасці СССР».

(Т. 13, л. с. 66).

Шырокае правядзенне шкодніцкіх мерапрыемстваў па Узбекістану поўнасцю пацвердзіў таксама абвінавачваемы **Ікрамаў,** які паказаў, што «права-трацкісцкі блок» паставіў перад ім наступныя задачы:

«... а) разгарнуць работу па падрыхтоўцы ва Узбекістане ўзброен...

(ПРАЦЯГ НА [illegible]-Й СТАР.).

ПРАЦЭС АНТЫСОВЕЦКАГА „ПРАВА-...

АБВІНАВАЎЧАЕ ЗАКЛЮЧЭННЕ

ПА СПРАВЕ Бухарына Н. І., Рыкава А. І., Ягоды Г. Г., Крэсцінскага Н. Н., Ракоўскага Х. Г., Розенгольца А. П., Іванова В. І., Чэрнова М. А., Грынько Г. Ф., Зеленскага І. А., Бессонава С. А., Ікрамава А., Хаджаева Ф., Шаранговіча В. Ф., Зубарэва П. Т., Буланава П. П., Левіна Л. Г., Плетнёва Д. Д., Казакова І. Н., Максімава-Дзікоўскага В. А. і Кручкова П. П.—

абвінавачваемых у тым, што яны па заданню разведак варожых да Савецкага Саюза замежных дзяржаў склалі змоўніцкую групу пад назвай „права-трацкісцкі блок", паставіўшую сваёй мэтаю шпіянаж у карысць замежных дзяржаў, шкодніцтва, дыверсіі, тэрор, падрыў ваеннай магутнасці СССР, правакацыю ваеннага нападу гэтых дзяржаў на СССР, расчляненне СССР і адрыў ад яго Украіны, Беларусі, Сярэднеазіяцкіх рэспублік, Грузіі, Арменіі, Азербайджана, Прымор'я на Далёкім Усходзе—у карысць памянёных замежных дзяржаў, нарэшце, звяржэнне ў СССР існуючага соцыялістычнага грамадскага і дзяржаўнага ладу і аднаўленне капіталізма, аднаўленне ўлады буржуазіі.

(ПРАЦЯГ)

га паўстання, прыўрочваючы яго да моманту інтэрвенцыі;

б) рашуча разгарнуць шкодніцкую і дыверсійную работу ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі з тым, каб вынікамі шкодніцтва выклікаць незадаволенне ў працоўных да савецкай улады і тым самым падрыхтаваць спрыяючую глебу для арганізацыі ў патрэбны момант узброенага паўстання».

«Апрача таго,—паказаў абвінавачваемы **Ікрамаў**,—па нашаму замыслу наша падрыўная шкодніцкая работа павінна была перашкаджаць умацаванню абаროназдольнасці СССР».

(Т. 12, л. с. 95—96).

Разрушальную дзейнасць як у галіне сельскай гаспадаркі, так і ў радзе іншых галін народнай гаспадаркі і соцыялістычнага будаўніцтва вялі і іншыя абвінавачваемыя па гэтай справе.

Так, абвінавачваемы **Грынько** вёў шкодніцкую работу ў галіне фінансаў.

Абвінавачваемы **Грынько** паказаў:

«Падрыўная работа па Наркамфіну праследвала асноўную мэту: паслабіць савецкі рубель, паслабіць фінансавую магутнасць СССР, заблытаць гаспадарку і выклікаць незадаволенне насельніцтва фінансавай палітыкай савецкай улады, незадаволенне падаткамі, незадаволенне дрэнным абслугоўваннем насельніцтва ашчаднымі касамі, затрымкамі ў выдачы заработнай платы і інш., што павінна было прывесці да арганізаванага шырокага незадаволення савецкай уладай і палегчыць змоўшчыкам вярбоўку прыхільнікаў і разварот паўстанчай дзейнасці».

(Т. 9, л. с. 79).

Абвінавачваемы **Зеленскі** і арганізаваныя ім у Цэнтрасаюзе і сістэме кааперацыі шкодніцкія групы заблытвалі планаванне па такіх таварах, як цукар, масла, яйкі, махорка і т. п., наўмысна затрымлівалі прасоўванне тавараў у вёску, заблытвалі ўсяляк учот і справаздачнасць, што садзейнічала беспакаранаму раскраданню і разбазарванню дзяржаўных сродкаў, заахвочвалі аблічванне і абкраданне спажыўца.

Гаворачы аб устаноўленай ім у Цэнтрасаюзе шкодніцкай сістэме ўчоту тавараў і справаздачнасці, абвінавачваемы **Зеленскі** паказаў:

«Пры такім становішчы злодзей заставаўся беспакараным, а чэсны работнік, у выніку складанага ўчоту, заблытваўся і неадкладна трапляў у растратчыкі».

(Т. 10, л. с. 56).

Здрадніцкую шкодніцкую дзейнасць у значных маштабах праводзіў таксама зараз выкрыты агент замежных разведак абвінавачваемы **Розенгольц.**

Аб сваёй здрадніцкай дзейнасці ў гэтай галіне абвінавачваемы **Розенгольц** паказаў наступнае:

«Паколькі **Троцкі** меў пагадненне з Германіяй і Японіяй, аб чым я быў паведамлен (як у часе перагавораў—пры спатканні з **Седовым** у 1933 годзе, так і аб адбыўшымся пагадненні—пры спатканні з ім у 1934 годзе) і меў у гэтых адносінах адпаведнае ўказанне **Троцкага,** то і мая шкодніцкая работа па знешняму гандлю служыла гэтай мэце».

(Т. 6, л. с. 48).

Адначасова з арганізацыяй актыўнай дыверсійна-шкодніцкай работы змоўшчыкі па загаду фашысцкіх разведак ставілі сваёй задачай выклікаць бандыцка-паўстанчы рух у нашай краіне, прыўрочваючы ўзброенае выступленне сваіх паўстанчых антысавецкіх банд у тылу Чырвонай Арміі да моманту пачатку інтэрвенцыі супроць СССР.

Абвінавачваемы **Рыкаў** паказаў:

«Мы сталі на шлях гвалтоўнага звяржэння кіраўніцтва партыі і савецкай улады, рашыўшы зрабіць гэта звяржэнне шляхам арганізацыі кулацкіх паўстанняў».

(Т. І, л. с. 150 об.).

Следствам устаноўлена, што гэтыя падрыхтоўваўшыяся кулацка-паўстанчыя ўзброеныя выступленні ў тылу Чырвонай Арміі знаходзіліся ў залежнасці ад планаў і разлікаў фашысцкіх дзяржаў, рыхтаваўшых напад на СССР, і што па сігналу генеральных штабаў фашысцкіх краін права-трацкісцкія змоўшчыкі і рыхтавалі свае выступленне.

Следуючы гэтым дырэктывам фашысцкіх разведак, удзельнікі змовы накаплівалі бандыцка-паўстанчыя кадры, падрыхтоўваючы іх да актыўных узброеных выступленняў на Далёкім Усходзе, Паўночным Каўказе і ў іншых месцах Савецкага Саюза, у прыватнасці, ва Узбекістане.

Па гэтаму поваду абвінавачваемы **Хаджаеў** паказаў:

«Асноўнай задачай практычнай работы нашых арганізацый была падрыхтоўка актыўных антысавецкіх кадраў і іх выхаванне ў духу барацьбы з СССР. Мы арыентавалі ўдзельнікаў арганізацыі на тое, што барацьба з савецкай уладай прыме вострыя формы і будзе даходзіць да ўзброеных сутычак. Таму мы аддавалі ўвагу падрыхтоўцы баявых сіл удзельнікаў нашай арганізацыі».

(Т. 13, л. с. 66).

Арганізатары бандыцка-паўстанчых кадраў абапіраліся толькі на астаткі старых контррэволюцыйных элементаў, арыентуючыся на папаўненне сваіх паўстанчых рэзерваў за кошт перакідваемых на тэрыторыю Савецкага Саюза астаткаў басмачаства, белагвардзейцаў, а таксама крымінальных бандытаў, заключоных у лагерах і т. д.

Абвінавачваемы **Ікрамаў** аб бандыцка-паўстанчай дзейнасці кіруемай ім буржуазна-нацыяналістычнай арганізацыі ва Узбекістане паказаў:

«Мы захоўвалі неабходныя кадры, якія ў будучым павінны былі быць скарыстаны для ўзброенай барацьбы супроць савецкай улады. Гэтымі кадрамі ў першую чаргу з'яўляліся астаткі кулацтва, духоўнікі і былыя басмачы. Мы далі заданне членам нашай арганізацыі, якія знаходзіліся на кіруючай раённай рабоце, аб захаванні гэтых кадраў. Апрача таго, мы меркавалі, што ў часе ўзброенага выступлення з-за кардона пяройдуць на савецкую тэрыторыю ўшоўшыя ў свой час астаткі басмачаскіх банд».

(Т. 12, л. с. 56).

Матэрыяламі следства і асабістымі паказаннямі абвінавачваемых **Бухарына, Зубарэва, Зеленскага** і іншых устаноўлена, што яны вялі актыўную падрыхтоўку паўстанчых кадраў, прабуючы ахапіць магчыма больш раёнаў Савецкага Саюза, прычым у мэтах максімальнага пашырэння паўстанчай базы, кіраўнікі змовы ўстанавілі кантакт і з нелегальна дзейнічаўшай эсэраўскай арганізацыяй.

Так, абвінавачваемы **Бухарын** паказаў:

«Устанаўленне сувязей з эсэрамі адносіцца да перыяду стаўкі арганізацыі правых на кулацкія паўстанні. У сувязі з тым, што правыя ішлі на арганізацыю гэтых паўстанняў, узнікла неабходнасць у сувязі з эсэрамі, меўшымі карэнні ў кулацкіх праслойках у вёсцы.

... Асабіста я праз **Сямёнава** ўстанавіў сувязь з падпольным ЦК эсэраў у Саюзе і праз **Членава** — з закардонным ЦК эсэраў у Парыжы».

(Т. 5, л. с. 90—91).

Такі ланцуг ганебных злодзеянняў «права-трацкісцкага блока», ажыццяўляўшага на працягу раду год сваю здрадніцкую дзейнасць у інтарэсах варожых СССР замежных дзяржаў.

II. ЗАБОЙСТВЫ ДЗЕЯЧОЎ САВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАВЫ С. М. КІРАВА, В. Р. МЕНЖЫНСКАГА, В. В. КУЙБЫШЭВА, А. М. ГОРКАГА

ЗМОВА СУПРОЦЬ В. І. ЛЕНІНА Ў 1918 ГОДЗЕ

Не маючы надзей на звяржэнне савецкага ладу метадамі шпіянажу, шкодніцтва, дыверсій, кулацкіх паўстанняў, права-трацкісцкія змоўшчыкі, ахопленыя злобай і нянавісцю да СССР, перайшлі да падрыхтоўкі і ўтварэння тэрарыстычных актаў супроць кіраўнікоў урада і ВКП(б).

Як устаноўлена следствам, па прамому згавору з японскай і германскай разведкамі і па заданню ворага народа **Л. Троцкага,** «права-трацкісцкі блок» арганізаваў і зрабіў рад тэрарыстычных актаў супроць лепшых людзей нашай радзімы.

Пераход «права-трацкісцкага блока» да тэрору абвінавачваемы **Рыкаў** матываваў наступным чынам:

«Пры нелегальным змоўніцкім характары контррэволюцыйнай арганізацыі правых, пры адсутнасці якой-небудзь масавай базы для яе контррэволюцыйнай работы, пры адсутнасці надзеі якім-небудзь іншым шляхам прысці да ўлады, — прынясце тэрору і «дварцовага перавароту» давала, па думцы цэнтра, якуюсьці перспектыву».

(Т. 1, л. с. 50).

Абвінавачваемы **Бухарын,** прызнаўшы на следстве, што на шлях тэрору «права-трацкісцкі блок» стаў яшчэ ў 1932 годзе, паказаў наступнае:

«У тым-жа 1932 годзе пры сустрэчы і разгаворы з **Пятаковым** я даведаўся ад яго аб яго спатканні з **Л. Седовым** і атрыманні ад **Седова** прамой дырэктывы **Троцкага** перайсці да тэрору супроць кіраўніцтва партыі і савецкай улады. Павінен таксама прызнаць, што па сутнасці тады мы і пайшлі на пагадненне з тэрарыстамі, а мой разгавор з **Пятаковым** з'явіўся пагадненнем аб каардынацыі нашых з **Троцкім** дзеянняў, накіраваных да гвалтоўнага звяржэння кіраўніцтва партыі і савецкай улады».

(Т. 5, л. с. 105 об.).

Тэрарыстычная дзейнасць змоўшчыкаў была цесна звязана з усёй іх паражэнчай работай, аб чым сведчыць, напрыклад, наступнае паказанне абвінавачваемага **Іванова:**

«Гаворачы аб тэроры, **Бухарын** заяўляў, што «ліквідаваць», як ён выражаўся, правадыроў партыі і савецкай улады... будзе вельмі важна для нашага прыходу да ўлады і будзе садзейнічаць паражэнню СССР у вайне».

(Т. 7, л. с. 81).

Следуючы прынятым у гэтых адносінах рашэнням, змоўніцкі блок шырока разгарнуў арганізацыю тэрарыстычных груп і практычную падрыхтоўку да ўтварэння тэрарыстычных актаў супроць кіраўнікоў ВКП(б) і савецкага ўрада.

Вось што паказаў па гэтаму поваду абвінавачваемы **Рыкаў:**

«К таму часу мы ўжо сталі на шлях тэрору, як аднаго з метадаў нашай барацьбы з савецкай уладай... Гэта наша пазіцыя вылілася ў вусім канкрэтную нашу і, у прыватнасці, маю дзейнасць па падрыхтоўцы тэрарыстычных актаў супроць членаў Палітбюро, кіраўнікоў партыі і ўрада, а ў першую чаргу супроць **Сталіна, Молатава, Кагановіча** і **Варашылава.** У 1934 годзе я ўжо даў заданне сачыць за машынамі кіраўнікоў партыі і ўрада створанай мною тэрарыстычнай групе **Арцёменкі».**

(Т. 1, л. с. 150 об.—151).

Абвінавачваемы **Бухарын,** гаворачы аб прапанове эсэра **Семёнава** арганізаваць тэрарыстычную групу, паказаў:

«Я хачу паказаць праўду і заяўляю, што прапанова гэта была мною далажана на нарадзе цэнтра і мы рашылі даручыць **Семёнаву** арганізацыю тэрарыстычных груп».

(Т. 5, л. с. 106 об.).

Следствам устаноўлена, што злачынскае забойства **С. М. Кірава,** ажыццёўленае ленінградскім трацкісцка-зіноўеўскім тэрарыстычным цэнтрам 1 снежня 1934 года, было ажыццёўлена таксама па рашэнню «права-трацкісцкага блока», удзельнікі якога прыцягнуты ў якасці абвінавачваемых па гэтай справе.

Следствам устаноўлена, што адным з саўдзельнікаў гэтага злачынскага забойства з'яўляўся абвінавачваемы **Ягода,** паказаўшы наступнае:

«Аб тым, што забойства **С. М. Кірава** рыхтуецца па рашэнню цэнтра змовы, я ведаў загадзя ад **Енукідзе. Енукідзе** прапанаваў мне не рабіць перашкод арганізацыі гэтага тэрарыстычнага акта, і я на гэта згадзіўся. З гэтай мэтай я выклікаў з Ленінграда **Запарожца,** якому і даў указанні не рабіць перашкод рыхтуючамуся тэрарыстычнаму акту над **С. М. Кіравым».**

(Т. 2, л. с. 209).

Гэта-ж пацвердзілі на следстве **Запарожац** і **Енукідзе.**

Забойствам **С. М. Кірава** не абмяжоўваецца злачынская тэрарыстычная дзейнасць права-трацкісцкіх здраднікаў і змоўшчыкаў.

Як устаноўлена следствам па гэтай справе, **А. М. Горкі, В. Р. Менжынскі** і **В. В. Куйбышэў** палі ахвярамі тэрарыстычных актаў, ажыццёўленых па заданню аб'яднанага цэнтра права-трацкісцкага блока.

Аб прычынах, пабудзіўшых права-трацкісцкіх змоўшчыкаў на нечуванае па сваёй страшэннасці забойства **А. М. Горкага,** абвінавачваемы **Ягода** паказаў:

«Аб'яднаны цэнтр права-трацкісцкай арганізацыі на працягу доўгага часу прабаваў апрацаваць **Горкага** і адарваць яго ад блізасці да **Сталіна.** У гэтых мэтах да **Горкага** былі прыстаўлены **Каменеў, Томскі** і рад іншых. Але рэальных рэзультатаў гэта не дало. **Горкі** паранейшаму веран **Сталіну** і з'яўляецца гарачым прыхільнікам і абаронцам яго лініі. Пры сур'ёзнай пастаноўцы пытання аб звяржэнні сталінскага кіраўніцтва і захопу ўлады права-трацкістамі—цэнтр не мог не ўлічваць выключнага ўплыву **Горкага** ў краіне, яго аўтарытэт за граніцай. Калі **Горкі** будзе жыць, то ён падыме свой голас пратэсту супроць нас. Мы не можам гэтага дапусціць. Таму, аб'яднаны цэнтр, пераканаўшыся ў немагчымасці адрыву **Горкага** ад **Сталіна,** вымушан быў вынесці рашэнне аб ліквідацыі **Горкага».**

(Т. 2, л. с. 200).

Паказанні абвінавачваемага **Ягоды** поўнасцю пацвярджаюцца і абвінавачваемым **Рыкавым,** які на допыце Пракурорам Саюза 10 студзеня г. г. паказаў:

«Мне вядома, што **Троцкі** праз сваіх прадстаўнікоў у кантактным цэнтры ўсяляк распальваў злобныя настроі ў адносінах **Горкага.** Гэта, натуральна, тлумачыцца тым, што **Троцкаму** было добра вядома, што **Горкі** лічыць яго прайдзісветам і авантурыстам. З другога боку, агульнавядомая блізасць **Горкага** да **Сталіна** і тая акалічнасць, што ён з'яўляецца неагібаемым палітычным прыхільнікам **Сталіна,** выклікала злобныя адносіны да яго нашай арганізацыі».

(Т. 1, л. с. 166, об).

Да гэтага абвінавачваемы **Рыкаў** дадаў:

«У 1935 годзе я гутарыў з **Енукідзе,** які прама мне заявіў, што трацкісцка-зіноўеўская частка блока настайвае на ліквідацыі палітычнай актыўнасці **Горкага** і для ажыццяўлення гэтага не спыніцца ні перад якімі сродкамі. З гэтага разгавору мне стала ясна, што можа пайсці гутарка і аб тэрарыстычных метадах ліквідацыі **Горкага».**

(Т. 1, л. с. 166, об.—167).

Гэта-ж пацвердзіў і абвінавачваемы **Бухарын,** паказаўшы, што ў пачатку 1935 года **Томскі** яму паведаміў, што:

«...трацкісцкая частка аб'яднанага цэнтра блока ўнесла прапанову аб арганізацыі варожага акта супроць **А. М. Горкага,** як прыхільніка сталінскай палітыкі».

(Т. 5., л. с. 119 об.).

Пры гэтым абвінавачваемы **Бухарын** растлумачыў, што ён не выключае, што тады гутарка ішла іменна аб фізічным устраненні **Горкага.** Тое, што гутарка ішла іменна аб падрыхтоўцы фізічнага ўстранення **М. Горкага,** відаць з паказанняў абвінавачваемага **Бессонава,** асабіста атрымаўшага такога роду «ўстаноўку» непасрэдна ад **Л. Троцкага** ў час спаткання з апошнім ў канцы ліпеня 1934 года.

Пры гэтым спатканні **Л. Троцкі,** як паказаў абвінавачваемы **Бессонаў,** заявіўшы, што—

«...было-б недаравальным жэманствам, калі мы паслядоўна заразжа не перайшлі-б да фізічнага ўстранення **Сталіна** і ўсіх яго бліжэйшых саратнікаў»...,—

сказаў—

«**М. Горкі** вельмі блізка стаіць да **Сталіна.** Ен адыгрывае выключна вялікую роль у заваяванні сімпатыі да СССР у грамадска-сусветнай дэмакратычнай думцы і асабліва Заходняй Еўропы. **Горкі** шырока папулярны, як бліжэйшы друг **Сталіна** і праваднік генеральнай лініі партыі. Учарашнія нашы прыхільнікі з інтэлігенцыі ў значнай меры пад уплывам **Горкага** адыходзяць ад нас. Пры гэтай умове я раблю вывад, што **Горкага** трэба ўбраць. Перадайце гэта маё даручэнне **Пятакову** ў самай катэгарычнай форме: «**Горкага** знішчыць фізічна ў што-б там ні стала».

(Т. 11, л. с. 74—75).

На падставе гэтай дырэктывы ворага народа **Л. Троцкага** «права-трацкісцкі блок» і прыняў сваё страшэннае рашэнне аб забойстве **А. М. Горкага.**

«Выкананне гэтага рашэння было даручана мне»—паказаў абвінавачваемы **Ягода.**

У якасці непасрэдных выканаўцаў гэтага злачыннага замыслу абвінавачваемы **Ягода** прыцягнуў абвінавачваемых па гэтай справе д-ра **Левіна Л. Г.,** былога хатняга ўрача **А. М. Горкага,** праф. **Плетнёва Д. Д.,** сакратара **А. М. Горкага—П. П. Кручкова** і свайго сакратара **Буланава П. П.**

Адзін з арганізатараў гэтага злачынства, абвінавачваемы **Буланаў** паказаў:

«Ва ўмярцвенні **А. М. Горкага** прымалі непасрэдны ўдзел прафесар **Плетнёў,** доктар **Левін** і сакратар **Горкага Кручкоў.** Я асабіста, напрыклад, быў сведкай таго, як **Ягода** не раз выклікаў да сябе **Кручкова,** раючы апошняму прастудзіць **Горкага,** выклікаць у яго тым ці іншым шляхам хваробу, **Ягода** падкрэсліваў, што стан лёгкіх у **Горкага** такі, што ўсякае прастуднае захворванне паскарае шансы яго пагібелі. А ўжо астатняе давершаць **Плетнёў** і **Левін,** якія наконт гэтага маюць адпаведныя заданні».

(Т. 16, л. с. 72).

Абвінавачваемы **Плетнёў,** які прымаў непасрэдны ўдзел у справе забойства **А. М. Горкага** і **В. В. Куйбышэва,** паказаў:

«**Ягода** мне заявіў, што я павінен дапамагчы яму ў фізічным устраненні некаторых палітычных кіраўнікоў краіны. Ен прама прапанаваў мне скарыстаць сваё становішча лечачага ўрача ў **Куйбышэва В. В.** і **А. М. Горкага** і паскорыць іх смерць шляхам прымянення няправільных метадаў лячэння. Я прабаваў адмовіцца, але ў канцы канцоў быў вымушан згадзіцца. Пасля гэтага **Ягода** мне паведаміў, што маім саўдзельнікам будзе доктар **Левін,** а ў адносінах **А. М. Горкага,** апрача таго і сакратар **А. М. Горкага—Кручкоў П. П.**

Прыняўшы гэта страшэннае заданне **Ягоды,** я разам з доктарам **Левіным** выпрацаваў план забойства **А. М. Горкага** і **В. В. Куйбышэва.**

Павінен прызнаць, што ў маёй згодзе на гэтыя злачынствы адыгралі сваю ролю і мае антысавецкія настроі. Гэтыя свае антысавецкія настроі я да арышту ўсяляк утойваў, двурушнічаючы і заяўляючы аб тым, што я савецкі чалавек».

(Т. 18, л. с. 72, 73).

Гэта-ж пацвердзіў і абвінавачваемы **Левін,** паказаўшы:

«Я прызнаю сябе вінаватым ў тым, што, прымяніўшы наўмысля няправільнае лячэнне і скарыстаўшы неадпавядаючыя данаму захворванню лякарствы, я разам з маімі саўдзельнікамі, па ўзгадненню з **Ягодай,** быў віноўнікам заўчаснай гібелі **Максіма Горкага** і **Куйбышэва».**

(Т. 17, л. с. 10).

Абвінавачваемыя **Левін** і **Плетнёў** на следстве далі падрабязныя паказанні аб тым, як яны практычна ажыццявілі ўмярцвенне **А. М. Горкага** і **В. В. Куйбышэва.**

Як устаноўлена следствам, у арганізацыі смерці **В. В. Куйбышэва** актыўны ўдзел прымаў таксама сакратар **Куйбышэва В. В.** — абвінавачваемы **Максімаў,** які паказаў наступнае:

«На гэта злачынства я пайшоў, як член контррэволюцыйнай арганізацыі правых, да якой я прымкнуў яшчэ ў 1928 годзе.

Ягода таксама ведаў аб маёй прыналежнасці да контррэволюцыйнай арганізацыі і прысутнічаў пры адным з маіх разгавораў з **Енукідзе,** калі мы распрацоўвалі план устранення **Куйбышэва».**

(Т. 20, л. с. 45 об.).

Па прамому ўказанню **Ягоды** абвінавачваемымі д-рам **Левіным** і д-рам **Казаковым** быў забіт таксама старшыня АДПУ **В. Р. Менжынскі.**

Абвінавачваемы **Казакоў** на допыце Пракурорам Саюза 4 лютага г. г. паказаў:

«**Ягода** заявіў мне, што **Менжынскі** да мяне добра адносіцца і даварае мне і таму мне разам з доктарам **Левіным** павінна ўдасца ўстраненне **Менжынскага. Ягода** даў мне наступнае ўказанне: я павінен выпрацаваць з доктарам **Левіным** такі метад лячэння **В. Р. Менжынскага,** які забяспечыць паскарэнне яго смерці і закончыць як мага хутчэй яго жыццё...»

(Т. 19, л. с. 51 об.).

Выклаўшы далей змест разгавору з ім абвінавачваемага **Ягоды** аб неабходнасці паскорыць наступленне смерці **В. Р. Менжынскага,** абвінавачваемы **Казакоў** паказаў:

«Пасля гэтага разгавору з **Ягодай** я выпрацаваў разам з **Левіным** такі метад лячэння **В. Р. Менжынскага,** які фактычна разрушаў яго апошнія сілы і абумоўліваў хутчэйшае наступленне смерці. Фактычна, такім чынам, я і **Левін** забілі **В. Р. Менжынскага.**

Я даў доктару **Левіну** складзеную мною сумесь лізатаў, якія ў спалучэнні з алкалоідамі прывялі да патрэбнага нам рэзультата, г. зн. фактычнага забойства **Менжынскага».**

(Т. 19, л. с. 51 об.).

Гэта поўнасцю пацвердзілі і абвінавачваемыя **Левін Л. Г.** і **Буланаў П. П.**

Абвінавачваемы **Левін Л. Г.** пацвердзіў, што, атрымаўшы ад абвінавачваемага **Ягоды** даручэнне паскорыць наступленне смерці **В. Р. Менжынскага,** ён, **Левін,** рашыў прыцягнуць да ажыццяўлення гэтага злачынства д-ра **Казакова.**

Абвінавачваемы **Левін** паказаў:

«Я сказаў, што лепш за ўсё гэта можа зрабіць **Казакоў,** бо ён дзейнічае прэпаратамі, якія сам бескантрольна рыхтуе ў сваёй лабараторыі, што ён успрысквае — вядома толькі яму аднаму.

Пасля папярэдніх падрыхтоўчых гутарак з **Казаковым** я перадаў яму атрыманую мною дырэктыву ад **Ягоды.** Ен спачатку вельмі хістаўся, баючыся раскрыцця злачынства, але потым згадзіўся. Я не пытаў, што ён ужываў, тым больш, што ён звычайна засакрэчваў свае прэпараты, але я ведаў, што магчымасці ў гэтых адносінах у яго шырокія.

Смерць **В. Р. Менжынскага** адбылася раптоўна сярод сну, калі не памыляюся, напярэдадні смерці Максіма **Пешкова** (сына А. М. Горкага), ад паралiча сэрца.

Я не сумняваўся, што гэта справа рук **Казакова».**

(Т. 17, л. с. 54—55).

Абвінавачваемы **Буланаў** па поваду забойства **В. Р. Менжынскага** паказаў:

«Фізічнае ўстраненне **Менжынскага Ягода** задумаў даўно. Ен не раз у маёй прысутнасці выказваў незадаволенне тым, што **Менжынскі** прадаўжаў жыць і займаць пост кіраўніка АДПУ. Потым ён прама сказаў, што трэба ўбраць **Менжынскага.** Арганізаваць гэта праз доктара **Левіна** было цяжка, таму што **Менжынскі Левіна** не любіў і лячыцца ў яго не хацеў. Тады я прапанаваў **Ягодзе** «прыстроіць» да **Менжынскага** якога-небудзь іншага ўрача. Так і было зроблена. І пры садзейнасці доктара **Левіна** да **Менжынскага** «прыстроілі» доктара **Казакова,** які і давёў справу да канца, г. зн. папросту гаворачы — паскорыў смерць **Менжынскага** шляхам заведама няправільнага яго лячэння».

(Т. 16, л. с. 75).

Паміма забойства **А. М. Горкага** і **В. В. Куйбышэва** абвінавачваемыя **Левін** і **Кручкоў** па прамому заданню абвінавачваемага **Ягоды** аналагічным шляхам у 1934 годзе ўмярцвілі таксама і сына **А. М. Горкага—М. А. Пешкова.**

Па гэтаму поваду абвінавачваемы **Левін** паказаў:

«Прызнаючы сябе вінаватым у забойстве **Максіма,** я хачу тут указаць на тое, што зрабіў гэта па прамому патрабаванню **Ягоды.** У мяне не хапіла грамадзянскай мужнасці адмовіцца і я стаў забойцай».

(Т. 17, л. с. 138, об.).

Абвінавачваемы **Кручкоў,** прымаўшы актыўны ўдзел у арганізаваных **Ягодай** злачынствах, паказаў:

«У гэтых злачынствах я кіраваўся дырэктывамі некаторых удзельнікаў антысавецкай арганізацыі правых. У прыватнасці, дырэктывамі **Ягоды.** Іменна ад **Ягоды** я атрымаў указанне гвалтоўна ўстраніць Максіма **Пешкова,** а затым і Алексея Максімавіча **Горкага».**

«Апрача мяне, **Ягода** прыцягнуў да ўдзелу ў гэтых злачынствах урачоў **Левіна** і **Вінаградава** і прафесара **Плетнёва».**

(Т. 21, л. с. 16).

Абвінавачваемы **Ягода,** пацвердзіўшы, што **М. А. Пешкоў** быў забіт па яго заданню, паказаў:

«У маі 1934 года, пры садзейнасці **Кручкова,** Макс (М. А. Пешкоў) захварэў крупозным запаленнем лёгкіх, а ўрачы **Левін, Вінаградаў** і **Плетнёў** залячылі яго да смерці».

(Т. 2, л. с. 193).

Абвінавачваемы **Ягода** пасля зняцця яго з пасады Народнага Камісара Унутраных Спраў СССР прыняў меры таксама да ажыццяўлення забойства Народнага Камісара Унутраных Спраў СССР тав. **Н. І. Ежова.**

Абвінавачваемы **Ягода** так тлумачыць у сваіх паказаннях прычыны, пабудзіўшыя яго фарсіраваць тэрарыстычны акт супроць **Н. І. Ежова:**

«Маё адхіленне ад работы ў НКВД, прыход на маё месца **Ежова** азначалі поўны правал нашай змовы, таму што ўтрымаць разгром кадраў антысавецкай арганізацыі нельга будзе. **Ежоў** раскапае ўсё,— трэба пазбавіцца ад **Ежова.** Гэта было адзінае рашэнне, да якога я прышоў і якое я пачаў рашуча рыхтаваць...»

(Т. 2, л. с. 141—142).

Гэты свой замысел **Ягода** прабаваў ажыццявіць праз сваіх саўдзельнікаў, віднейшая роля сярод якіх належала абвінавачваемаму **Буланаву.**

Па прызнанню абвінавачваемага **Ягоды** і абвінавачваемага **Буланава** забойства тав. **Н. І. Ежова** меркавалася ажыццявіць шляхам атручання спецыяльна прыгатаванай для гэтай мэты атрутай.

«Калі **Ягода** быў знят з НКВД, —паказаў абвінавачваемы **Буланаў,** — ён даў мне і свайму асабістаму даручэнцу **Савалайнену** прамое заданне — атруціць **Ежова».**

(Т. 16, л. с. 27).

Падрабязна апісаўшы спосабы, пры дапамозе якіх абвінавачваемы **Ягода** прабаваў ажыццявіць забойства тав. **Н. І. Ежова,** абвінавачваемы **Буланаў** паказаў, што ён, **Буланаў,** сам рабіў сумесь атрут, прызначаных для атручання тав. **Ежова.**

Абвінавачваемы **Ягода** на допыце ў Пракуратуры Саюза ССР поўнасцю прызнаў гэта свае злачынства, паказаўшы:

«Так, вымушан прызнаць, што я падрыхтоўваў гэта злачынства. Арганізоўваў падрыхтоўку забойства **Ежова,** як чалавека, які небяспечны для контррэволюцыйнай змовы і які можа выкрыць нашу контррэволюцыйную арганізацыю».

(Т. 2, л. с. 209).

Такім чынам, следства лічыць устаноўленым з несумненнасцю, што прыцягнутыя па гэтай справе да крымінальнай адказнасці кіруючыя ўдзельнікі «права-трацкісцкага блока» зрабілі тэрарыстычныя акты супроць **С. М. Кірава, В. Р. Менжынскага, В. В. Куйбышэва, А. М. Горкага, М. А. Пешкова** і падрыхтоўвалі рад іншых тэрарыстычных актаў, якія ажыццявіць не паспелі.

Забойствы савецкіх дзеячоў завяршылі сабой круг найцяжэйшых дзяржаўных злачынстваў, пры дапамозе якіх банда прэзрэнных адшчапенцаў нашай радзімы, правакатараў царскай ахранкі, наймітаў замежных разведак, прадаваўшых замежным капіталістам нашу зямлю і нашу свабоду, імкнуліся ажыццявіць фашысцкі план звяржэння савецкага ладу і аднаўлення ў нашай краіне капіталізма.

Як цяпер высветлілася, гэтыя страшэнныя злачынствы не былі выпадковасцю ні для трацкістаў, ні для правых.

Следствам устаноўлена, што ўжо ў 1918 годзе, непасрэдна ўслед за Кастрычніцкай рэволюцыяй, у перыяд заключэння Брэсцкага міру, **Бухарын** і яго група так званых «левых» комуністаў і **Троцкі** з яго групай сумесна з «левымі» эсэрамі арганізавалі змову

(ПРАЦЯГ НА ...-И СТАР.)

ПРАЦЭС АНТЫСОВЕЦКАГА „ПРАВА-ТРАЦКІСЦКАГА БЛОКА“

АБВІНАВАЎЧАЕ ЗАКЛЮЧЭННЕ

ПА СПРАВЕ Бухарына Н. І., Рыкава А. І., Ягоды Г. Г., Крэсцінскага Н. Н., Ракоўскага Х. Г., Розенгольца А. П., Іванова В. І., Чэрнова М. А., Грынько Г. Ф., Зеленскага І. А., Бессонава С. А., Ікрамава А., Хаджаева Ф., Шаранговіча В. Ф., Зубарэва П. Т., Буланава П. П., Левіна Л. Г., Плетнёва Д. Д., Казакова І. Н., Максімава-Дзікоўскага В. А. і Кручкова П. П.—

абвінавачваемых у тым, што яны па заданню разведак варожых да Савецкага Саюза замежных дзяржаў склалі змоўніцкую групу пад назвай «права-трацкісцкі блок», паставіўшую сваёй мэтаю шпіянаж у карысць замежных дзяржаў, шкодніцтва, дыверсіі, тэрор, падрыў ваеннай магутнасці СССР, правакацыю ваеннага нападу гэтых дзяржаў на СССР, расчляненне СССР і адрыў ад яго Украіны, Беларусі, Сярэдне-Азіяцкіх Рэспублік, Грузіі, Арменіі, Азербайджана, Прымор'я на Далёкім Усходзе — у карысць памянёных замежных дзяржаў, нарэшце, звяржэнне ў СССР існуючага соцыялістычнага грамадскага і дзяржаўнага ладу і аднаўленне капіталізма, аднаўленне ўлады буржуазіі.

(ПРАЦЯГ)

супроць **В. І. Леніна**, як главы савецкага ўрада.

Бухарын і іншыя змоўшчыкі, як гэта відаць з матэрыялаў следства, мелі сваёй мэтай сарваць Брэсцкі мір, звергнуць савецкі ўрад, арыштаваць і забіць **В. І. Леніна, І. В. Сталіна і Я. М. Свердлова** і сфармаваць новы ўрад з бухарынцаў, якія тады для маскіроўкі называлі сябе «левымі» комуністамі, трацкістаў і «левых» эсэраў.

Дапытаны ў Пракуратуры Саюза 19 і 20 лютага гэтага года былы член цэнтральнага камітэта партыі «левых» эсэраў **В. А. Карэлін** даў наступныя паказанні аб змоўніцкай дзейнасці ў 1918 годзе эсэраў і бухарынцаў:

«Канчатковая згода з «левымі» комуністамі ў барацьбе супроць савецкага ўрада на чале з **Леніным, Сталіным і Свердловым** была намі дасягнута пасля VII з'езда комуністычнай партыі.

Перагаворы з «левымі» комуністамі вялі па даручэнню ЦК «левых» эсэраў **Камкоў, Прош'ян** і я».

(Т. 44, л. с. 86).

Гаворачы аб характары гэтых перагавораў і ролі абвінавачваемага **Бухарына Н. І., Карэлін В. А.** далей паказаў:

«Прапанова **Бухарына** была — не спыняцца на арышце ўрада, а правесці фізічнае знішчэнне кіраўнікоў савецкай улады і, у першую чаргу, **Леніна і Сталіна**».

(Т. 44, л. с. 38).

Гэта-ж пацвердзілі і іншыя асобы, дапытаныя ў якасці сведкаў па гэтай справе.

Адзін з былых кіраўнікоў цэнтральнага камітэта партыі «левых» эсэраў **Б. Д. Камкоў** паказаў:

«Я асабіста меў разгавор з **Бухарыным**, які мне заявіў, прыкладна, наступнае: «Барацьба ў нас у партыі супроць пазіцыі **Леніна** па пытанню аб Брэсцкім міры прымае вострыя формы. У нашых радах дэбатуецца пытанне аб стварэнні новага ўрада з «левых» эсэраў і «левых» комуністаў». Пры гэтым **Бухарын** назваў **Пятакова**, як магчымага кандыдата ў кіраўнікі новага ўрада і заявіў, што змена ўрада мысліцца шляхам арышту яго склада на чале з **Леніным**.

Далейшыя перагаворы з **Бухарыным** вяліся **Карэліным і Прош'янам**. К канцу сакавіка месяца паміж «левымі» комуністамі і «левымі» эсэрамі было дасягнута канчатковае пагадненне аб тым, што:

1. «Левыя» комуністы ў барацьбе з большавікамі і савецкім урадам аказваюць «левым» эсэрам арганізацыйную і палітычную дапамогу;
2. Сумеснымі дзеяннямі «левых» эсэраў і «левых» комуністаў павінен быць скінут урад **Леніна** і сфармаван новы ўрад у складзе «левых» комуністаў і «левых» эсэраў.

Пасля гэтага «левыя» эсэры арганізавалі забойства **Мірбаха** і ліпеньскі мяцеж. У курсе рыхтаваўшагася забойства **Мірбаха** і ліпеньскага мяцежа «левыя» комуністы былі поўнасцю».

(Т. 44, л. с. 92 об.).

Дапытаныя ў якасці сведкаў у Пракуратуры СССР 19 лютага гэтага года былыя кіраўнікі і актыўныя ўдзельнікі групы «левых» комуністаў **Якаўлева В. Н., Осінскі В. В. і Манцэў В. Н.** поўнасцю пацвердзілі наяўнасць у 1918 годзе змовы, арганізаванай па ініцыятыве абвінавачваемага **Бухарына** блокам «левых» комуністаў і «левых» эсэраў супроць **В. І. Леніна**, як главы савецкага ўрада.

Так, **Якаўлева В. Н.** паказала:

«**Бухарын** мне развіў тую мысль, што палітычная барацьба набывае ўсё больш вострыя формы і справа не можа абмежавацца адной толькі палітычнай фармулёўкай аб недавер'і да ЦК партыі. **Бухарын** заявіў, што справа няўхільна павінна дайсці да змены кіраўніцтва, у сувязі з чым стаіць пытанне аб арышце **Леніна, Сталіна і Свердлова** і нават аб фізічным іх знішчэнні»...

(Т. 44, л. с. 77).

Осінскі В. В. па гэтаму поваду паказаў:

«Асноўны разгавор аб нашых мерах па звяржэнню ўрада **Леніна** ў мяне быў з **Бухарыным Н. І.** Прыблізна ў маі 1918 г. (або канцы красавіка) я меў гутарку з **Бухарыным**, у якой запытаў яго, наколькі праўдзівы мае весткі аб яго намерах падвергнуць арышту ўрад **Леніна**.

Бухарын не адмаўляў такога свайго намеру».

(Т. 44, л. с. 54).

Гаворачы далей аб гэтых «мерах», **Осінскі В. В.** паказаў:

«Аб блоку «левых» комуністаў з «левымі» эсэрамі мне стала вядома ад **Якаўлевай**, а затым ад **Бухарына**. Мне было таксама вядома ад іх, што ў сакавіку або красавіку 1918 года **Бухарын** выступіў на бюро (маскоўскім абласным) з прапановай арыштаваць **Леніна, Сталіна і Свердлова**. Пры гэтым **Бухарын** падкрэсліў, што ён схіляецца да таго пункта гледжання, што пасля арышту ўрада трэба будзе **Леніна, Сталіна і Свердлова** фізічна знішчыць».

(Т. 44, л. с. 88 об.).

Аналагічнае паказанне даў і **Манцэў В. Н.**, дапытаны ў Пракуратуры Саюза 20 лютага г. г., а іменна:

«Я пацвярджаю, што паміж «левымі» комуністамі і «левымі» эсэрамі быў заключан блок.

Я пацвярджаю, што, прыкладна, у сакавіку—красавіку на вузкім пасяджэнні бюро **Бухарын** зрабіў даклад, у якім дапусціў рад паклёпніцкіх сцвярджэнняў па адрасу савецкага ўрада і прапанаваў арганізаваць звяржэнне савецкай улады і арыштаваць **Леніна, Сталіна** і **Свердлова з тым, каб** фізічна іх знішчыць».

(Т. 44, л. с. 82).

Аб ролі **Л. Троцкага** ў змове супроць **В. І. Леніна** ў 1918 годзе абвінавачваемы **Бухарын** паказаў:

«К гэтаму часу зноў узнікла ідэя перавароту і арышту **Леніна, Сталіна і Свердлова**, як вызначаючых фігур партыйнага і савецкага кіраўніцтва, на гэты раз па ініцыятыве **Троцкага**, якому прапанова «левых» эсэраў стала вядома, відавочна, як я мяркую, ад **Пятакова**».

(Т. 5, л. с. 124).

Дапытаная на папярэднім следстве **Якаўлева В. Н.** паказала:

«**Троцкі** лічыў, што палітычная барацьба знаходзіцца толькі ў самым пачатку, што яна можа дайсці да самых агрэсіўных форм, што супроць пазіцыі **Леніна** па пытанню аб міры «левыя» комуністы знойдуць падтрыманне ў «левых» эсэраў і ў іншых партый, што трэба рыхтавацца да змены ўрада і арышту яго правадыроў, з **Леніным** і **Сталіным** на чале. **Троцкі** лічыў, што ў такі вострым перыяд рэволюцыі, пры далейшым развіцці барацьбы, справа можа не абмежавацца адным толькі арыштам правадыроў, што з арышту з лагічнай немінучасцю выцякае і пытанне аб іх фізічным устраненні».

(Т. 44, л. с. 78).

Адзін з кіраўнікоў групы «левых» комуністаў **Манцэў В. Н.**, дапытаны на папярэднім следстве, паказаў:

«Праз некалькі дзён пасля разгавору з **Якаўлевай** мяне запрасіў да сябе **Троцкі**. Я з ім меў тады вялікі разгавор на яго кватэры, прычым **Троцкі** тады падрабязна развіваў мысль аб неабходнасці забойства **Леніна і Сталіна**».

(Т. 44, л. с. 84).

Следства ў сучасны момант распалагае неабвержнымі данымі аб тым, што зроблены 30 жніўня 1918 года эсэраўскай тэрарысткай **Ф. Каплан** злачынны замах на жыццё **В. І. Леніна** з'явіўся прамым рэзультатам ажыццяўлення злачынных замыслаў «левых» комуністаў на чале з **Бухарыным Н. І.** і іх саўдзельнікаў — «левых» і правых эсэраў, і па ініцыятыве абвінавачваемага **Бухарына**.

На допыце ў Пракуратуры Саюза ССР ад 19 лютага г. г. **Карэлін В. А.** паказаў:

«Я павінен таксама прызнаць самае цяжкае злачынства — удзел «левых» эсэраў і «левых» комуністаў у арганізацыі замаху на **Леніна**. 20 год утойваўся гэты факт ад савецкага народа. Было ўтоена, што мы разам з правымі эсэрамі па настаянню **Бухарына** прабавалі забіць **Леніна**. Працэс правых эсэраў не ўскрыў сапраўднай абстаноўкі гэтага злачынства і не выявіў ролі ў ім «левых» эсэраў і «левых» комуністаў.

Пасля ліпеньскага мяцежа ЦК «левых» эсэраў прыняў рашэнне аб пераходзе да тэрарыстычных метадаў барацьбы з савецкім урадам.

Неабходна заўважыць, што **Прош'ян** і пасля мяцежа сустракаўся з **Бухарыным**, які прама паставіў перад ім пытанне аб фізічным знішчэнні **Леніна**. Дакладней, пытанне аб тэрарыстычным акце супроць **Леніна** было паднята **Бухарыным** у другой палове ліпеня 1918 года. Аб гэтым **Прош'ян** даласжыў нам, членам ЦК «левых» эсэраў».

Такога роду патрабаванне «левых» комуністаў адыграла сваю ролю ў сэнсе паскарэння тэрарыстычнага акта супроць **Леніна**, зробленага ЦК правых эсэраў.

(Т. 44, л. с. 86—87).

Гэта-ж пацвердзіў і **Осінскі В. В.** на допыце ад 19 лютага гэтага года, паказаўшы наступнае:

«У канцы 1918 года **Стукаў**, які разам з **Бухарыным** быў звязан з эсэрамі, сказаў мне, што стрэл, зроблены правай эсэркай **Каплан** у **Леніна**, быў учынен не толькі па ўказанню кіраўніцтва правых эсэраў, але і з'явіўся рэзультатам мерапрыемстваў, намечаных у свой час блокам «левых» комуністаў з эсэрамі і накіраваных да фізічнага знішчэння **Леніна, Сталіна і Свердлова**.

(Т. 44, л. с. 89).

На праведзеных Пракуратурай Саюза ССР вочных стаўках з абвінавачваемым **Бухарыным** сведкаў **Осінскага В. В., Якаўлевай В. Н., Манцэва В. Н., Карэліна В. А.** і **Камкова Б. Д.**, апошнія поўнасцю пацвердзілі свае паказанні, выкладзеныя вышэй.

Пад цяжарам гэтых улік абвінавачваемы **Бухарын** прызнаў рад злачынных фактаў і паказаў:

«Я павінен прызнаць, што ў нас быў непасрэдны кантакт з «левымі» эсэрамі, якія базіраваўся на платформе гвалтоўнага звяржэння савецкага ўрада на чале з **Леніным, Сталіным і Свердловым**, з паследуючым арыштам **Леніна, Сталіна** і **Свердлова** і стварэннем новага ўрада з «левых» комуністаў і «левых» эсэраў»...

(Т. 5, л. с. 122 об.).

Устаноўленыя ў сучасны момант даныя аб злачынствах, зробленых абвінавачваемым **Бухарыным** і ворагам народа **Троцкім** у 1918 г. супроць савецкай дзяржавы і яе кіраўнікоў **В. І. Леніна, І. В. Сталіна і Я. М. Свердлова**, праліваюць поўны свет на ўсю паследуючую злачынную контррэволюцыйную дзейнасць банды **Бухарына** і **Троцкага**, абвінавачваемай у сучасны момант у найцяжэйшых дзяржаўных злачынствах, учыненых ёю па прамых заданнях фашысцкіх разведак у перыяд 1921—1937 гг.

ФОРМУЛА АБВІНАВАЧАННЯ

Следства лічыць устаноўленым, што:

1. У 1932-33 гг. па заданню разведак варожых да СССР замежных дзяржаў абвінавачваемымі па гэтай справе была складзена змоўніцкая група пад назвай «права-трацкісцкі блок», паставіўшая сваёй мэтай шпіянаж у карысць замежных дзяржаў, шкодніцтва, дыверсіі, тэрор, падрыў ваеннай магутнасці СССР, правакацыю ваеннага нападу гэтых дзяржаў на СССР, паражэнне СССР, расчляненне СССР і адрыў ад яго Украіны, Беларусі, Сярэдне-Азіяцкіх рэспублік, Грузіі, Арменіі, Азербайджана і Прымор'я на Далёкім Усходзе — у карысць памянёных замежных дзяржаў, нарэшце, звяржэнне існуючага ў СССР соцыялістычнага грамадскага і дзяржаўнага ладу і аднаўленне ў СССР капіталізма і ўлады буржуазіі.

2. «Права-трацкісцкі блок» уступіў у зносіны з некаторымі замежнымі дзяржавамі ў мэтах атрымання з іх боку ўзброенай дапамогі для ажыццяўлення сваіх злачынных замыслаў.

3. «Права-трацкісцкі блок» сістэматычна займаўся ў карысць гэтых дзяржаў шпіянажам, снабжаючы замежныя разведкі важнейшымі дзяржаўнымі сакрэтнымі весткамі.

4. «Права-трацкісцкі блок» сістэматычна ажыццяўляў шкодніцкія і дыверсійныя акты ў розных галінах соцыялістычнага будаўніцтва (у прамысловасці, у сельскай гаспадарцы, на чыгуначным транспарце, у галіне фінансаў, комунальнай гаспадаркі і т. д.).

5. «Права-трацкісцкі блок» арганізаваў рад тэрарыстычных актаў супроць кіраўнікоў ВКП(б) і савецкага ўрада і ажыццявіў тэрарыстычныя акты супроць **С. М. Кірава, В. Р. Менжынскага, В. В. Куйбышэва, А. М. Горкага.**

Усе абвінавачваемыя ўлічаюцца як паказаннямі сведкаў, так і маючымiся ў справе дакументальнымі данымі і рэчавымі доказамі і поўнасцю прызналі сябе вінаватымі ў прад'яўленых ім абвінавачаннях.

На падставе выкладзенага **абвінавачваюцца:**

1) **Бухарын** Нікалай Іванавіч, 1888 года нараджэння; 2) **Рыкаў** Алексей Іванавіч, 1881 года нараджэння; 3) **Ягода** Генрых Грыгор'евіч, 1891 года нараджэння; 4) **Крэсцінскі** Нікалай Нікалаевіч, 1883 года нараджэння; 5) **Ракоўскі** Хрысціян Георгіевіч, 1873 года нараджэння; 6) **Розенгольц** Аркадзій Паўлавіч, 1889 года нараджэння; 7) **Іваноў** Владзімір Іванавіч, 1893 года нараджэння; 8) **Чэрноў** Міхаіл Александравіч, 1891 года нараджэння; 9) **Грынько** Грыгорый Фёдаравіч, 1890 года нараджэння; 10) **Зеленскі** Ісаак Абрамавіч, 1890 года нараджэння; 11) **Бессонаў** Сяргей Алексеевіч, 1892 года нараджэння, 12) **Ікрамаў** Акмаль, 1898 года нараджэння; 13) **Хаджаеў** Файзула, 1896 года нараджэння; 14) **Шаранговіч** Васілій Фаміч, 1897 года нараджэння; 15) **Зубарэў** Пракопій Цімафеевіч, 1886 года нараджэння; 16) **Буланаў** Павел Петровіч, 1895 года нараджэння; 17) **Левін** Леў Грыгор'евіч, 1870 года нараджэння; 18) **Плетнёў** Дзмітрый Дзмітрыевіч, 1872 года нараджэння; 19) **Казакоў** Ігнацій Нікалаевіч, 1891 года нараджэння; 20) **Максімаў-Дзікоўскі** Веніямін Адамавіч (Абрамавіч), 1900 года нараджэння; 21) **Кручкоў** Пётр Петровіч, 1889 года нараджэння,— у тым, што, з'яўляючыся актыўнымі ўдзельнікамі антысавецкай змовы, зрабілі найцяжэйшыя дзяржаўныя злачынствы, указаныя ў п. п. 1—5 формулы абвінавачання, прадугледжаныя арт арт. 58-1 а, 52-2, 58-7, 58-8, 58-9 і 58-11 КК РСФСР, а абвінавачваемыя **Іваноў, Зеленскі** і **Зубарэў**, апрача таго, зрабілі злачынствы, прадугледжаныя арт. 58-13 КК РСФСР.

У выніку выкладзенага ўсе ўказаныя вышэй абвінавачваемыя падлягаюць суду Ваеннай Калегіі Вярхоўнага Суда Саюза ССР.

Справы ў адносінах **Осінскага В. В., Якаўлевай В. Н., Манцэва В. Н., Карэліна В. А., Камкова Б. Д., Стукава І. Н., Арцёменка Е. В., Запарожца І. В., Саволайнена І. М., Семёнава Г. І.** і **Членова С. Б.** — выдзелены ў асобае праізводства.

Справа ў адносінах д-ра **Вінаградава А. І.** за яго смерцю праізводствам спынена.

Справа ў адносінах **Енукідзе А. С.** разгледжана Ваеннай Калегіяй Вярхоўнага Суда СССР 15 снежня 1937 года.

Гэта абвінаваўчае заключэнне складзена ў г. Маскве 23 лютага 1938 года.

Пракурор Саюза ССР **А. ВЫШЫНСКІ.**

ВАЕННАЙ КАЛЕГІІ ВЯРХОЎНАГА СУДА СССР

Велізарнейшым гневам і нянавісцю напоўніліся нашы сэрцы, калі мы даведаліся, што тройчы праклятыя вырадкі, здраднікі, шпіёны і забойцы з права-трацкісцкай банды Троцкага, Бухарына, Рыкава і інш. хацелі прадаць нашу бацькаўшчыну азвярэламу фашызму, раскрамсаць свяшчэнную зямлю нашай дарагой радзімы, затапіць у крыві здабытыя ў баях свабоду і шчасце вялікага савецкага народа.

Усё лепшае, усё перадавое чалавецтва жахнулася ад нябачанай у гісторыі чорнай здрады подлых іуд, злачыннай зграі халопаў капітала.

З чым параўнаць злачынствы гэтых шалёных фашысцкіх сабак?

Змрочнае і жудаснае сярэдневяковае, кастры інквізіцыі, звярынае іезуіцтва— усё гэта меркне перад метадамі і сродкамі гэтых падкалодных змей.

Яны падымалі свае брудныя акрываўленыя рукі на лепшых людзей чалавецтва, на вялікіх Леніна і Сталіна — геніяў і правадыроў працоўных і прыгнечаных усяго свету.

Перад намі ўстаюць першыя дні Кастрычніка, гераічны рабочы Петраград, уся маладая ўзброеная Савецкая краіна. Галодная і разбураная сусветнай вайной, яна выйшла на абарону свабоды свяшчэннай свабоды ад нашэсця чатырнаццаці імперыялістычных дзяржаў. Белагвардзейскія полчышчы, нямецкія генералы, японскія самураі, польскія паны, англійскія і французскія інтэрвенты ўзнялі крыжовы паход супроць нашай рэволюцыі. Але ў няроўным баі рэволюцыйны народ перамог. Ен перамог таму, што вялікія Ленін і Сталін кіравалі яго мужнай барацьбой, жылі ў сэрцы кожнага байца соцыялістычнай рэволюцыі. А ў гэты час загаворшчыкі, правакатары і тэрарысты — Троцкі, Бухарын, Рыкаў, разам з гнуснымі падонкамі царскай ахранкі — эсэрамі, меншавікамі і нацыяналістамі з-за вугла накіроўвалі сваю зброю ў чыстыя і благародныя сэрцы Леніна, Сталіна, Свердлова.

Вышкаленыя агенты міжнародных ахранак, яны хацелі знішчыць савецкую ўладу і ўстанавіць уладу буржуазіі.

Бруднай крывёю сваёй заплоціць злачынная зграя за подлую чорную здраду.

Гестапаўскія махляры, яны імкнуліся распрадаць самае дарагое, што ёсць у савецкага народа, — яго вялікую радзіму, яго светлае і шчаслівае жыццё.

Яны імкнуліся разарваць сувязі сталінскай дружбы народаў, аддаць пад ярмо фашысцкіх дзяржаў Украіну, Беларусь і другія братнія рэспублікі.

Нашу родную Савецкую Беларусь, якая пышна расквітнела пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі, права-трацкісцкія бандыты разам з буржуазнымі нацыяналістамі прагнулі задушыць пад ботам нямецкіх і польскіх фашыстаў. Але свабодны беларускі народ — нашы рабочыя, нашы калгаснікі, наша інтэлігенцыя, якія перажылі шматвяковы гнёт нямецкіх памешчыкаў і польскай шляхты, жудасці нямецкай і польскай акупацыі, — ніколі не дазволіць ступіць подлай назе інтэрвентаў на сваю свяшчэнную і непарушную зямлю.

Бруднай крывёй сваёй заплоціць злачынная зграя за подлую чорную здраду.

У вяках будуць праклятыя імёны забойцаў, на руках якіх гарыць благародная кроў Кірава, Куйбышэва, Менжынскага, Горкага.

Родны Аляксей Максімавіч, горды наш буравеснік!

Яшчэ так нядаўна чулы, ветлівы і скромны, ты вучыў нас бязмежна любіць нашу радзіму, яе вялікіх правадыроў, наш народ, яго цудоўную сучаснасць і светлую будучыню. Ты вучыў нас ненавідзець лютых ворагаў народа — фашыстаў, якія знішчаюць найвялікшыя здабыткі сусветнай культуры.

На ўвесь свет гучэў твой мудры голас вяшчуна соцыялістычнага гуманізма і большавіцкай праўды і знаходзіў жывы водгук у сэрцах усяго прагрэсіўнага чалавецтва.

Не дрогнула рука забойцы, які ля ложка хворага замест лякарства сыпаў у шклянку яд, які адабраў у народа любімага яго сына, геніяльнага рускага пісьменніка, чалавека вялікага, палымнеючага сэрца.

Будзьце праклятыя, подлыя забойцы!

Неўмiручым агнём гараць словы вялікага Горкага: — «Калі вораг не здаецца — яго знішчаюць!»

Бруднай крывёй сваёй заплоціць злачынная зграя за подлую чорную здраду.

Не зацямніць нікому і ніколі сталінскае сонца!

Высока над радзімай гараць рубінавыя крэмлёўскія зоры, іх яркае святло далёка відаць за межамі нашай краіны.

На варце нашага радаснага жыцця мужна і пільна стаіць атуленая ўсенароднай любоўю савецкая разведка на чале з маршалам савецкай разведкі Нікалаем Іванавічам Ежовым.

Слава бясстрашным чэкістам, рыцарам пролетарскага меча!

Ад усёй душы дзякуй вам, верныя сыны народа — непахісныя і бязлітасныя да ворагаў народа, доблесныя наркамунутдзельцы, за выкрыццё прэзрэннай права-трацкісцкай банды.

Ад усёй душы дзякуй Вам, наш родны і любімы таварыш Сталін, за бацькоўскія клопаты аб беларускім народзе, за шчаслівае жыццё, за ачыстку нашай савецкай зямлі ад фашысцкай нечысці.

Выкрыццё фашысцкай банды яшчэ і яшчэ раз напамінае нам, што мы знаходзімся ў капіталістычным акружэнні, адкуль падсылаюцца да нас забойцы, шпіёны і дыверсанты. Мацаваць рэволюцыйную пільнасць — вось першы абавязак савецкага грамадзяніна. Мы абяцаем яшчэ вышэй узняць рэволюцыйную пільнасць, цясней згуртавацца вакол вялікай партыі Леніна—Сталіна, вакол правадыра народаў таварыша І. В. Сталіна.

Таварышы члены Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда!

Мы, савецкія пісьменнікі БССР, далучаем свой голас да перапоўненага гневам голасу ўсяго савецкага народа і патрабуем знішчыць гадаў, змесці іх з твару зямлі.

Благародная кроў вялікіх сыноў народа—Горкага, Кірава, Куйбышэва і Менжынскага — кліча да самай бязлітаснай кары.

Патрабуем шалёных фашысцкіх сабак расстраляць — усіх да аднаго!

ЯНКА КУПАЛА.
ЯКУБ КОЛАС.
МІХАСЬ ЛЫНЬКОЎ.
КУЗЬМА ЧОРНЫ.
ПЯТРУСЬ БРОЎКА.
КАНДРАТ КРАПІВА.
ІВАН ШАПАВАЛАЎ.
ПЯТРУСЬ ГЛЕБКА.
М. КЛІМКОВІЧ.
А. АЛЕКСАНДРОВІЧ.
І. ГУРСКІ.
А. КУЛЯШОЎ.
Г. КАМЯНЕЦКІ.
А. КУЧАР.
Ц. ДАЎГАПОЛЬСКІ.
З. АКСЕЛЬРОД.
М. ТЭЙФ.
Я. МАЎР.
М. ХВЕДАРОВІЧ.
Э. АГНЯЦВЕТ.
А. ЯКІМОВІЧ.
М. КАЛАЧЫНСКІ.
А. СТАХОВІЧ і іншыя.

СМЕРЦЬ ФАШЫСЦКІМ НАЙМІТАМ!

Савецкая краіна ўздрыгнула ад гневу і агіды, даведаўшыся з кароткага паведамлення Пракуратуры СССР аб жудасных, кашмарных злачынствах «права-трацкісцкага блока».

На працягу доўгіх гадоў прэзрэнная кучка здраднікаў, шпіёнаў і забойцаў, рэўнасна служачы міжнароднаму імперыялізму, падкопвалася пад шчасце і добрабыт савецкага народа. Лоўка маскуючы свае сапраўдныя мэты і намеры, штомінутна запэўняючы ўсіх у сваёй вернасці ідэалам комуністычнай партыі і рабочага класа, фарысеі і двурушнікі, шпіёны і дыверсанты, забойцы і бандыты цішком дагаварваліся аб новых замахах і здрадах, аб новых тэрарыстычных актах, абмяркоўваючы на сваіх канспіратыўных пасяджэннях, якой атрутай лепш забіваць любімых правадыроў і кіраўнікоў рабочага класа.

Яшчэ напярэдадні Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі ворагі працоўнага народа — Каменеў, Зіноўеў і іх прыспешнікі пачалі сваю чорную справу здрады і шпіянажу. З першага дня перамогі рабочага класа над буржуазіяй Зіноўеў, Каменеў, Рыкаў і іншыя разам з меншавікамі і эсэрамі ярасна змагаліся за ліквідацыю дыктатуры пролетарыята.

Кожнае мерапрыемства савецкай улады Троцкі, Бухарын і іншыя лакеі капіталізма сустракалі ў штыхі. Асабліва шалёнае супраціўленне з боку трацкістаў і бухарынцаў сустрэла прапанова Леніна аб неадкладным заключэнні міру з імперыялістычнай Германіяй. Бухарынцы, якія стаялі за «рэволюцыйную» вайну, і трацкісты, прапанаваўшыя перайсці на пазіцыі «ні вайны, ні міру», хутка дагаварыліся, бо ў іх была адна мэта, адна задача — **справакаваць уварванне нямецкіх войск на тэрыторыю савецкай Расіі з тым, каб скінуць дыктатуру пролетарыята.**

Як зараз высветлена, «ужо ў 1918 годзе, непасрэдна ўслед за Кастрычніцкай рэволюцыяй, у перыяд заключэння брэсцкага міру, Бухарын і яго група так званых «левых» комуністаў і Троцкі з яго групай разам з «левымі» эсэрамі арганізавалі загавор супроць В. І. Леніна, як главы савецкага ўрада.

Бухарын, Троцкі і іншыя загаворшчыкі, як гэта відаць з матэрыялаў следства, мелі сваёй мэтай сарваць брэсцкі мір, скінуць савецкі ўрад, арыштаваць і забіць **В. І. Леніна, І. В. Сталіна і Я. М. Свердлова** і сфармаваць новы ўрад, з бухарынцаў, якія тады для маскіроўкі называлі сябе «левымі» комуністамі, трацкістаў і «левых» эсэраў.

У выніку прамога здрадніцтва Троцкага і Бухарына маладая савецкая рэспубліка была пастаўлена пад удары яшчэ моцнага тады германскага імперыялізма. Узброеныя да зубоў нямецкія полчышчы ўварваліся на тэрыторыю Савецкай Расіі.

Аднак, дзякуючы пільнасці ЦК нашай партыі на чале з Леніным і Сталіным, супраціўленне ярасных ворагаў міру — Бухарына, Троцкага, Крэсцінскага, Радэка, Пятакова і іншых было зломлена. Мір быў заключаны, передышка завяявана і рэволюцыя выратавана.

Але подлыя ворагі народа не склалі сваёй атручанай зброі.

Вораг народа Л. Троцкі, як гэта цяпер высветлена, быў звязан, як шпіён, з адной замежнай разведкай ужо з 1921 года і з другой замежнай разведкай — з 1926 года.

Прадаўшыся замежным разведкам, гэтыя іуды - здраднікі прадоўжвалі ажыццяўляць «сваю шпіёнскую, шкодніцкую дыверсійную дзейнасць па прамому заданню Троцкага, Бухарына, Рыкава і паводле планаў, шырока задуманых і распрацаваных у генеральных штабах некаторых замежных дзяржаў».

З цынізмам прафесіянальных садыстаў — забойцаў яны арганізавалі і ажыццявілі зладзейскае ўмярцвенне **В. В. Куйбышэва, В. Р. Менжынскага** і **А. М. Горкага**, арганізавалі і ажыццявілі зладзейскае забойства **С. М. Кірава.**

Удзельнікі «права-трацкісцкага блока» для дасягнення сваіх злачынных мэт не пагарджалі нічым. Шпіянаж, шкодніцтва, дыверсіі, тэрор, правакацыі, забойствы з-за вугла і т. д. — усё ўваходзіла ў іх арсенал барацьбы з працоўнымі Савецкага Саюза.

Гэтыя вырадкі, страціўшыя ўсякі чалавечы вобраз, рыхтавалі «крыжовы паход» фашысцкіх мракабесаў супроць краіны соцыялізма, рыхтавалі паражэнне СССР і адрыў ад яго багацейшых абласцей, у тым ліку Савецкай Беларусі. Шпіёны і здраднікі, буржуазныя нацыяналісты рыхтавалі народам шчаслівай, радаснай Беларускай Савецкай Соцыялістычнай Рэспублікі гакое-ж фашысцкае ярмо, якое надзета «яснавяльможнымі панамі» на шыю народаў Заходняй Беларусі і Польшчы. Яны жадалі зноў вярнуць беларускі народ пад ярмо памешчыкаў, фабрыкантаў і паліцэйскіх ахранак, яны жадалі зноў вярнуць усе жудасці яўрэйскай рысы аселасці, увергнуць беларускі і яўрэйскі народы ў рабства і жабрацтва.

Але не бываць гэтаму! Яшчэ раз праличыліся шпіёны і здраднікі і іх гаспадары — фашысцкія бандыты. Дзякуючы пільнасці комуністычнай партыі і яе мудрага правадыра таварыша **Сталіна**, дзякуючы гераічнай і дакладнай рабоце аднаго з лепшых саратнікаў вялікага Сталіна **Нікалая Іванавіча Ежова** і яго слаўных чэкістаў— і гэтая карта міжнароднага імперыялізма біта.

Вялікі спіс жудасных злачынстваў «права-трацкісцкага блока» супроць працоўных Савецкага Саюза, супроць працоўных усяго свету.

Сэрца кожнага рабочага, калгасніка, кожнага чэснага савецкага грамадзяніна сціскаецца ад болю пры думцы аб вялікіх афярах вырваных з нашых радоў праклятымі, прэзрэннымі забойцамі. Не чуваць больш звонкага голаса палкага трыбуна рэволюцыі **Сергея Міронавіча!** Закрыліся навечна зоркія вочы вялікага рускага пісьменніка, геніяльнага мастака і адданейшага друга працоўнага чалавецтва **Алексея Максімавіча!** Спынілася біенне сэрцаў любімых сыноў соцыялістычнай радзімы **Менжынскага і Куйбышэва!**

Брудныя лапы подлых забойцаў, перарвалі іх прыгожае жыццё, пакінуўшы невылечную рану ў сэрцы краіны.

Але прышоў канец мярзотным здраднікам і забойцам! Шпіёны і правакатары — на лаве падсудных, і суровы прыгавор савецкага суда блізкі.

Няхай плачуць фашысцкія ахранкі па сваіх адданых памочніках. Яны пазбавіліся яшчэ адной апоры ў нашай краіне. Самыя агалцелыя і мацёрыя бандыты— на лаўцы падсудных! Магутным чэкісцкім ударам развеяна, як, дым, яшчэ адна надзея імперыялістычных драпежнікаў, надзея на дапамогу «пятай калоны» ўнутры нашай краіны ў часе будучай вайны.

Слава вялікаму Сталіну і яго саратніку таварышу Ежову!

Народы Савецкага Саюза, у тым ліку народы Савецкай Беларусі, ніколі не забудуць геройскіх спраў нашых слаўных чэкістаў!

Як шалёных сабак будзем біць контррэволюцыйную нечысць!

Ачысцім нашу свяшчэнную зямлю ад усякай шпіёнскай сволачы! Смерць фашысцкім наймітам!

Будзем мацаваць абарону нашай савецкай краіны і рыхтаваць сакрушальны ўдар па ворагу пры першай яго спробе напасці на нас!

Удзесяцярым нашу пільнасць. Будзем трымаць граніцу на моцным замку! Напору шпіёнаў і дыверсантаў фашысцкіх разведак супроцьпаставім стальную сцяну народнай пільнасці і, адданасці нашай прыгожай соцыялістычнай Радзіме!

ШКОЛА ТАЛЕНТАЎ

Чырвоная Армія даўно ўжо славіцца сваёй мастацкай самадзейнасцю Яшчэ ў гады грамадзянскай вайны і міжнароднай інтэрвенцыі, калі азвярэлы вораг насядаў з усіх бакоў, імкнучыся знішчыць маладую совецкую рэспубліку, у часцях Чырвонай Арміі былі створаны першыя калектывы мастацкай самадзейнасці. Чытальнікі і дэкламатары, спевакі і танцоры, музыканты і частушачнікі — поруч з агітатарамі і прапагандыстамі працавалі над умацаваннем баявой і палітычнай магутнасці Чырвонай Арміі. Потым з гэтых калектываў мастацкай самадзейнасці выраслі моцныя тэатры, ансамблі, тэатры рэволюцыйнай сатыры (так званыя «Тэрэвсаты»), рознастайныя канцэртныя брыгады і г. д., якія далі совецкаму мастацтву тысячы выдатных кваліфікаваных работнікаў.

Сваю ганаровую ролю — школы мастацтва, школы культуры — Чырвоная Армія выконвае ўсе дваццаць год свайго існавання.

Сама выхоўваючыся спачатку ў гарніле грамадзянскай вайны, потым ва ўпартай барацьбе за ўмацаванне абароны краіны, Чырвоная Армія разам з тым выхавала і выхоўвае дзесяткі тысяч выдатных спевакоў, танцораў, музыкантаў, дэкламатараў, якія пасля звароту дадому павялічваюць сабой рады ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці рабочых клубаў, калгасных дамоў соцыялістычнай культуры і нават рады прафесіянальных работнікаў мастацтва.

Асноўнае адрозненне чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці ад самадзейнасці прадпрыемстваў і калгасаў — у яе выключнай масавасці. Есць падраздзяленні, дзе ў мастацкай самадзейнасці прымаюць удзел усе байцы і камандзіры. Палкавыя агляды мастацкай самадзейнасці, як правіла, доўжацца тры-чатыры дні, а часам і цэлую шасцідзёнку. У хуткім тэмпе змяняючы адзін аднаго, праходзяць перад строгімі суддзямі калектывы і салісты мастацкай самадзейнасці падраздзяленняў, дабіваючыся гонару выступіць на дывізійных альбо гарнізонных алімпіядах.

Вось часць, якой камандуе тав. Сяргеенка.

Хор пад кіраваннем малодшага камузвода тав. Бальшакова, натхнёны ўсесаюзным ансамблем чырвонаармейскай песні і пляскі, стварыў літаратурны мантаж «Дваццаць год Чырвонай Арміі». Коратка і сцісла апавядаюць байцы аб найбольш яркіх эпізодах грамадзянскай вайны. Кожны эпізод ілюструецца песняй, сугучнай гэтаму эпізоду альбо прысвечанай яму. Усё разам стварае яркую карціну гістарычных паходаў і перамог Чырвонай Арміі. Праўда, паасобныя галасы чытальнікаў уносяць некаторы дысанас у агульны ансамбль, хор патрабуе яшчэ значнай шліфоўкі. Але ўпартасць, з якой калектыў перамагае ўсе цяжкасці, варта пахвалы.

Хор у суправаджэнні духавога аркестра пад кіраваннем тав. Маркіна. Гэта найбольш сыграны калектыў. Асабліва моцная жаночая група хора, складзеная з жонак камандзіраў. «Песня аб Сталіне», «Казацкая песня», песні аб Чапаеве і Жэлезняку пакідаюць вельмі добрае ўражанне.

Два струнных аркестры, джаз-аркестр, ансамбль гарманістаў, шумавы аркестр, шматлікія сольныя выступленні (дэкламатары, гарманісты, ксілафаніст, танцоры) — усё гаворыць аб вялікім багацці гэтай чырвонаармейскай часці ў галіне мастацкай самадзейнасці.

Але зусім выключнымі і своеасаблівымі з'яўляюцца нацыянальныя калектывы — чувашскі і татарскі хоры, нацыянальныя песні і пляскі—татарскія, чувашскія, башкірскія. Асабліва трэба адзначыць таленавітага музыканта, плясуна, дэкламатара—чырвонаармейца Абдрахманава. Яго багаты рознастайны рэпертуар мог-бы сам па сабе запоўніць цэлы вечар. Вось ён з вялікім тэмпераментам чытае на татарскай мове верш «Далорэс», вось ён выконвае флоцкі танец, вось ён удзельнічае ў татарскім нацыянальным хоры, потым выдатна выконвае башкірскі нацыянальны танец, на саратаўскім гармоніку (са званочкамі) іграе нацыянальныя татарскія матывы, башкірскую пляску і г. д.

Можна сказаць загадзя, што далейшы жыццёвы шлях гэтага народнага самародка не пойдзе міма прафесіянальнага тэатра, альбо якога-небудзь нацыянальнага ансамбля песні і пляскі. Чырвоная Армія з'яўляецца добрай школай на гэтым шляху.

Вось часць, дзе камісарам тав. Грыгор'еў. Яе мастацкая самадзейнасць адзначаецца багаццем сольных нумароў, зробленых культурна, уважліва і з вялікай любоўю. Выдатныя яе чытальнікі-дэкламатары Вальфсон і Новікаў. Вельмі прыгожы фінскі танец у выкананні жонкі лейтэнанта Бышэўскай і малодшага камандзіра Аспідава. Выключна добра выконваюць рад балетных нумароў жонка камандзіра Вароніна і чырвонаармеец Дрэйчын.

Калі ў асобе тав. Дрэйчына мы маем культурнага выканаўца, які прышоў з тэатра, то ў асобе жонкі камандзіра Варонінай маем таленавітую танцаўшчыцу-самавучку. Усё, што Вароніна выконвае — «Масква», «Цыганскі танец» і інш.—прасякнута надзвычайнай лёгкасцю, натуральнасцю, непаддзельнай грацыяй.

Моцнае ўражанне выклікаюць песні ў выкананні жонкі камандзіра тав. Леўса. У яе выдатны, чысты голас.

Арыгінальныя нацыянальныя грузінскія танцы ў выкананні малодшага камандзіра Мішыняна.

Весела і жвава праходзіць масавы танец «Калінка» у суправаджэнні хора...

Шматстайны рэпертуар мастацкай самадзейнасці часцей Чырвонай Арміі. Тысячы чырвонаармейцаў, камандзіраў, іх жонак і дзяцей запаўняюць штодзённа клубы і чырвоныя куткі, аддаючы свой вольны час любімай справе. І з кожным днём удасканальваюцца і растуць выдатныя народныя таленты.

Чырвоная Армія з'яўляецца не толькі грознай сілай, здольнай сакрушыць ворага. Чырвоная Армія з'яўляецца своеасаблівай універсальнай школай, дзе выхоўваюцца ўсебакова развітыя, культурныя грамадзяне Совецкага Саюза. І ў гэтай школе не мала ўвагі аддаецца развіццю мастацкіх схільнасцей кожнага байца з тым, каб ён пасля звароту на завод, у калгас мог стаць актыўным удзельнікам вясёлага, яркага, радаснага жыцця.

Р. БАРЫСАЎ.

НАД ЧЫМ МЫ ПРАЦУЕМ

Рэдакцыя звярнулася да раду работнікаў літаратуры і мастацтва з просьбай паведаміць—над чым яны зараз працуюць. Адказы на гэта пытанне будуць друкавацца сістэматычна.

Друкуем першыя адказы.

КАМПАЗІТАР Н. І. АЛАДАЎ

— За апошнія годы я адчуваю асаблівы прыліў творчых думак, творчага настрою. Гэта тлумачыцца тым, што жыць у нас стала лепш, жыць стала весялей. Багацце ўяўленняў выклікае ўсё новы ўздым натхнення.

За апошнія годы я напісаў рад буйных рэчаў: сімфанічны твор «Казка-быль», прысвечаны эпапеі чалюскінцаў, нанет (твор для дзевяці інструментаў) на беларускія народныя тэмы, капрычыё для аркестра, прысвечанае XX гадавіне Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, — таксама на беларускія народныя тэмы (гэты твор нядаўна выконваўся ў Ленінградзе Філармоніяй пад кіраўніцтвам Мусіна), санаціна для валторны — па заданню духавой кафедры Кансерваторыі.

Я таксама напісаў рад вакальных рэчаў, прысвечаных Сталінскай Канстытуцыі («Морам зашумела» і «Эх, ты, жыццё маё»), выбарам у Вярхоўны Совет («Сустрэча наркома»). Напісаў масавую песню, прэміраваную на конкурсе, абвешчаным Упраўленнем па справах мастацтваў, антырэлігійныя частушкі і інш.

Зараз я скончыў вялікую работу над эскізамі для сімфоніі, якую я думаю напісаць у бліжэйшы час. Сімфонія — на тэмы нашай рэчаіснасці.

Гэтымі днямі заканчваю музыку на словы Я. Купалы «Пад чырвонай зоркай», прысвечаную XX гадавіне Чырвонай Арміі.

Думаю, што бліжэйшыя годы будуць яшчэ больш плённымі.

ПІСЬМЕННІК ЗМІТРОК БЯДУЛЯ

— Бліжэйшыя тры месяцы я прысвячу сцэнарыю на тэмы народных беларускіх казак. Гэта з'явіцца першым вопытам інсцэніравання народных казак для кіно.

Беларускі фальклор вельмі багаты казкамі. Для сцэнарыя я абраў чатыры казкі, аб'яднаныя адной ідэяй — ідэяй барацьбы з памешчыкамі і духавенствам. Казкі запісаны на Палессі і адносяцца да перыяду прыгону. Аб змесце іх гавораць загалоўкі: «Аб тым, як ксёндз вылячыўся», «Пану навука», «Мужык і пан», «Ці была ў папа галава». Усе чатыры казкі ў вострай сатырычнай форме высмейваюць памешчыкаў, ксяндзоў і папоў. У адной з іх — «Пану навука» — расказваецца аб адным народным герої Рымшы, які вёў з памешчыкамі актыўную барацьбу.

Усе чатыры казкі будуць аб'яднаны ў адным фільме. Фільм будзе ставіць кіностудыя Белдзяржкіно, якая мяркуе правесці здымкі ў Беларусі гэтым летам.

КАМПАЗІТАР А. В. БАГАТЫРОЎ

— Напярэдадні XX гадавіны Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі я скончыў сімфонію, прысвечаную Вялікаму Кастрычніку.

Зараз я працую над операй «Дрыгва» паводле аповесці Я. Коласа (лібрэта Е. Рамановіча). Опера скончана ў клавіры і зараз я прыступіў да аркестроўкі, якую мяркую скончыць да першага ліпеня.

Музыка оперы «Дрыгва» прасякнута беларускім фальклорам, не гледзячы на тое, што ў ёй скарыстана толькі адна беларуская песня.

У оперы ёсць песня аб Будзённым і песня аб Варашылаве. Першая заканчвае трэці акт, а другой заканчваецца ўся опера.

Дарэчы, у інфармацыі, апублікаванай у «Лім» 30 студзеня, няправільна ўказана, быццам песня аб Будзённым да оперы «Дрыгва» напісана тав. Любанам. Гэта мой арыгінальны твор.

Трэба адзначыць, што працаваць прыходзіцца ў нездавальняючых кватэрных умовах. Гэтымі днямі мяне наведаў старшыня Менскага горсовета тав. Ванееў. Спадзяюся, што горсовет прыме, нарэшце, неабходныя меры для стварэння спрыяючых умоў для плённай работы.



Ансамбль песні і пляскі Менскага ваеннага вучылішча.

Фота І. Каплінскага.

СЕКЦЫЯ ДРАМАТУРГАЎ ПРАЦУЕ СЛАБА

Вясной мінулага года адбыўся бурны сход драматургаў, на якім жорстка крытыкаваліся многія памылкі і недахопы ў рабоце бюро секцыі драматургаў. Было выбрана новае бюро ў складзе К. Чорнага (старшыня), К. Крапівы і М. Модэля. Пасля гэтага схода драматургі больш не збіраліся, нават па творчых пытаннях. Засядала некалькі разоў бюро секцыі, вызначаліся добрыя планы, але, нажаль, гэтыя планы ў пераважнай большасці заставаліся не выкананымі. Праўда, бюро секцыі правяло чытку п'ес Глазырына, Клімковіча, Бядулі, дыспут па спектаклю «Салавей». Але ці не мала гэтага за 9 месяцаў існавання новага бюро? Вельмі мала.

Намячаўся вельмі важны сход па пытанню аб росце беларускай драматургіі за 20 год. Быў вызначаны дакладчык — тав. Вольскі. Сход два разы пераносіўся і... заглох. Аб ім больш не ўспамінаюць.

Гаварылі ў секцыі пра тое, што варта было-б сабраць драматургаў і абмеркаваць творы, у якіх паказана грамадзянская вайна і Чырвоная Армія, але далей гутарак справа пакуль не пайшла.

Яшчэ ў мінулым годзе былі намечаны творчыя вечары Галаўчынера, Міровіча, Рамановіча, Крапівы і іншых драматургаў. Але ні адзін з гэтых вечароў не праведзен. Ці ведае секцыя, над чым працуюць зараз драматургі—Рамановіч, Галаўчынер, Міровіч і інш.? Ці пацікавілася яна, чаму так даўно няма іх п'ес і ці пішуцца яны наогул? Не, не пацікавілася.

Нешта не чуваць, каб бюро секцыі па-сур'ёзнаму арганізавала пераклады лепшых беларускіх п'ес на мовы народаў СССР. А ў нас ёсць такія п'есы, якія варты таго, каб іх вывесці на саюзную сцэну. А самадзейнае мастацтва! Колькі таленавітых людзей, аб'яднаных у самадзейных гуртках, чакаюць хвалюючых п'ес, высокамастацкіх і сцэнічна не складаных, прыгодных для пастаноўкі ў калгасах, рабочых клубах, у гушчах шчаслівага народа.

Ці прыслухалася секцыя драматургаў да гэтых запросаў гурткоў? Не, нешта не чуваць.

Многія пачынаючыя спрабуюць сваё пяро і ў галіне драматургіі, у гэтым самым складаным жанры літаратуры. Ці правільна, што ўся работа па выхаванню маладых драматургаў перакладзена на яшчэ слабыя плечы габінета маладога аўтара? Не, няправільна. Габінет не мае дастатковых сіл, каб аднаму справіцца з усёй гэтай работай. Арганізацыя дапамогі найбольш таленавітым пачынаючым драматургам павінна была зацікавіць драматургічную секцыю.

Рукапіс драматурга яшчэ не стаў асновай работы драмсекцыі. Настаў ужо сакавік. А драмсекцыя яшчэ не мае цвёрдага плана творчай работы, які быў-бы абмеркаван сходам драматургаў.

Секцыя драматургаў працуе зусім слаба!

КРЫТЫК.

„Вочная стаўка“ на самадзейнай сцэне

Старэйшы ў Віцебску самадзейны драматычны гурток клуба будаўнікоў паказаў свайму гледачу чарговую работу — пастаноўку п'есы Л. Шэйніна і бр. Тур «Вочная стаўка».

Маляр і пячнік, столяр і атынкоўшчык — будаўнікі, рабочыя і работніцы, прыходзілі пасля працы ў свой клуб, развучвалі ролі, рэпетыравалі, дапамагалі адзін другому ў творчай працы, настойліва авалодвалі сцэнічным майстэрствам.

Гуртоўцы і кіраўнік гуртка тав. А. Ур'еў з захапленнем працавалі каля двух месяцаў над пастаноўкай і стварылі цікавы спектакль. Гуртоўцы правільна зразумелі ідэйную накіраванасць п'есы, яе вобразы, таму іх спектакль выклікае ў гледача глыбокую нянавісць да ворагаў і абуджае лепшыя патрыятычныя пачуцці — пачуцці любві да нашай радзімы.

Добра выконвае ролю следчага Ларцава гуртковец І. М. Мальчык. Тав. Мальчык паказаў глыбокую нянавісць Ларцава да ворагаў і любоў яго да радзімы, да нашых людзей. Гэты вобраз у спектаклі — праўдзівы і цікавы.

Справіліся з ролямі і гуртоўцы тт. Перах (доктар Руч'ёў), Шабашова (дачка Руч'ёва), Бабылёў (кравец Гурэвіч). Яны стварылі вобразы совецкіх грамадзян — патрыётаў нашай радзімы.

Добра раскрыў вобраз вышкаленага шпіёна фашысцкай разведкі Іванова гуртковец тав. Будняцкі.

Праўда, многім гуртоўцам — таварышам Розінай, Рэвелісаву, Грудніку і іншым — трэба больш настойліва працаваць над сваімі ролямі. У іх ігры шмат аднатоннасці, сухасці. Яны яшчэ не авалодалі асновамі сцэнічнага майстэрства.

Але ўвогуле пастаноўка «Вочная стаўка» — поспех самадзейнага драматычнага гуртка клуба будаўнікоў.

Тое, што самадзейныя гурткі працуюць над буйнымі пастаноўкамі і ствараюць цікавыя спектаклі, сведчыць аб росце культуры і майстэрства ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці, сведчыць аб тым, што ў самадзейных гуртках творча растуць таленавітыя людзі.

Зараз драматычны гурток будаўнікоў працуе над пастаноўкай п'есы «Зямка Копач» Даніэля.

Р. Юр.

МІЖНАРОДНЫ КОНКУРС ПІЯНІСТАЎ

У маі бягучага года ў Брусэлі адбудзецца міжнародны конкурс піяністаў, арганізуемы бельгійскім «Музычным фондам» у гонар вядомага скрыпача і кампазітара Эжэна Ізаі. Член журы конкурса ад Совецкага Саюза прафесар Е. Файнберг паведаміў нашаму карэспандэнту наступнае:

— Для ўдзелу ў гэтым цікавым міжнародным конкурсе вылучаны пяць маладых совецкіх піяністаў: Эміль Гілельс—вучань праф. Нейгауза, Ісак Міхноўскі—вучань праф. Ігумнава, Павел Серэбракоў—вучань праф. Нікалаева, Роза Тамаркіна—вучаніца праф. Гольдэнвейзера і Якаў Фліер—вучань праф. Ігумнава.

Умовы конкурса своеасаблівыя і прад'яўляюць высокія патрабаванні да яго ўдзельнікаў. Конкурс складаецца з трох тураў—двух папярэдніх і аднаго заключнага. Удзельнікі першага тура павінны будуць выканаць адзін з наступных твораў Баха: «Італьянскі канцэрт», «Храматычная фантазія», Партыта і Таката до-мінор. За тры месяцы да конкурса «Музычны фонд» укажа адну з санат, якую абавязаны развучыць і выканаць удзельнік конкурса. Акрамя таго, на першым туры піяністы будуць выконваць адну з класічных санат па ўласнаму выбару.

Праграма другога тура конкурса складаецца з твораў сучасных кампазітараў, якія ўказваюцца арганізатарамі конкурса за тры месяцы да пачатку спаборніцтваў, а таксама з санаты па ўказанню «Музычнага фонда».

На канчатковым іспыце піяністы выканаюць канцэрт з акампаніментам аркестра, шэсць п'ес па ўласнаму выбару, прычым адну з іх абавязкова бельгійскага кампазітара. Пасля агалашэння рэзультатаў папярэдніх іспытаў піяністы, допушчаныя да фінальнага тура, атрымаюць рукапіс невыданага музычнага твора для раяля з аркестрам. На працягу 7 дзён яны павінны будуць развучыць яго.

Да канчатковых іспытаў допускаецца ўсяго 12 чалавек. Мы ўпэўнены, што па прыкладу мінулых конкурсаў совецкія піяністы зоймуць на гэтым конкурсе пачэснае месца.

А. МАІСЕЕЎ.

Масква.

Ц. Доўгапольскі

ДЗІЦЯЧЫ ДОКТАР

(АПАВЯДАННЕ)

І.

Прыехаўшы з вёскі, з месячнай камандыроўкі, Вера Койль адразу-ж акунулася ў сваю работу. За кароткі час, у які яна абслугоўвала калгасы, яна зрабілася дужэйшай і спакайнейшай, хоць яна і раней лічылася сярод яе гарадскіх пацыентаў спакойным і цярплівым доктарам, які выслухоўвае хворага з вялікай увагай.

Калі Вера вярнулася з работы, яна ў сваім прыёмным пакоі напаткала аднаго з сваіх знаёмых пацыентаў — рабочага не то абутковай, не то швейнай фабрыкі. Ен прасіў дапамагчы.

— Што здарылася? — запытала Вера. Яна прышла з работы вельмі стомленая.

— Дзіцё душыцца. Костка ад рыбы ў горле.

— Ужо гадзіна ночы, а дзеці яшчэ не спяць! — упікнула яна свайго пацыента.

— От у гэтым і справа, — адказаў ён. — Я прыходжу з фабрыкі — свежая рыба, а калі свежая рыба — ім самыя моцныя сонныя каплі не дапамогуць.

Гаварлівасць і спакойнасць бацькі-рабочага ўсё-ж усхвалявалі Веру. Яна моўчкі выняла французскі ключ з рэдыкуля, адчыніла дзверы, асвятліла пакой, дастала з шкляной паліцы патрэбныя інструменты і выйшла з кватэры, наставіўшы каўнер зімовага паліто.

Вера Койль крыху злавалася, што да яе прыходзяць у такі позні час, што пацыенты забываюцца на тое, што яна ніколі не была хірургам.

Апрача таго, яна прышла з работы не ў зусім добрым настроі. Справы з яе Рэліным, які выехаў з яго брыгадай некуды на поўнач, к Архангельску, выехаў ужо даўно і не піша, былі кепскія. Яна таксама дрэнна сябе адчувала. Вось ужо дваццаць сёмая зіма, а яна ўсё яшчэ жыве адна ў яе натопленым, светлым пакоі і не ведае, колькі гэта будзе цягнуцца... Будаваць жыццё з Рэліным, ці без Рэліна? Ей пачынае падабацца другі...

Ноч была ціхая, снежная. Вуліца была добра асветлена. Скрыпучыя крокі прахожых, апошнія пары, пары, якія спяшаюцца, альбо, наадварот, якія не спяшаюцца, якія дазваляюць усім абганяць сябе і глядзець адзін другому ласкава ў твар, нібы яны ўпершыню сустрэліся, гаварлівасць рабочага, які між іншым заўважыў: «Я таксама гэтак шпацыраваў — э!». Усё гэта хвалявала.

2.

Сям'я рабочага непакоілася. Дзіцё ўсё яшчэ душылася. Суседзі давалі розныя парады, пакуль усе з радасцю не ўбачылі Веру.

Койль паклала дзіцё к сабе на калені і пры святле паглядзела яму ў рот. Так, костка тырчыць зусім блізка. Яна хутка дастала яе і, як належыць маладому доктару, паказала ўсім прысутным, як трафей.

Ад удалай аперацыі да яе вярнуўся добры настрой. Яна нават павесялела. Яна лічылася сярод яе калег і знаёмых чалавекам, які смяецца першы і заражае іх сваёй жыццёрадаснасцю.

Ручны гадзіннік паказваў каля двух, калі яна падымалася па сходках у свае мі калідоры.

3.

Ад свайго бацькі-каваля Койль пераняла не толькі жыццёрадаснасць. Яна атрымала ад яго ў спадчыну стройны стан, дужасць мускулатуры, сіметрыю ліній.

Пасля халоднага душа яна падышла да люстэрка. Выціраючыся мяккім ручніком, яна пагражала Рэліну.

— Не пішаш, таварыш Рэлін. Я доўга чакаць не буду, таварыш Рэлін, — і кінулася ў шырокі ложак з чыстага нікеля, і адразу-ж заснула...

Раніца пачалася незвычайна. Койль выходзіць у яе турэцкім халаце ў прыёмны пакой і дзівіцца з нечаканасці. Тут стаіць шмат яе пацыентаў. Яны ўсе апрануты па-святочнаму. Першай каля дзвярэй стаіць маці таго дзіцяці, які душыўся. Яна стаіць з добрай маўклівай усмешкай.

— Таварышка, — звяртаецца яна да Койль,—мы толькі-што заўважылі, што вы выйшлі з хаты. Вы абавязкова прыдзіце да нас на свежую рыбу. Калі вы не прыдзеце, дык вы нас пакрыўдзіце...

Койль рассмяялася і абяцала прыйсці.

Другім у чарзе стаяў вартаўнік, якога яна нядаўна лячыла. Цяпер ён выглядаў больш бадзёра і ўпэўнена. Яго твар добра паголены. Вочы — яснейшыя. Голас — чысцейшы.

— Вы напэўна ведаеце майго сына,— пачаў вартаўнік. — Вы лячылі гэтымі днямі яго дзяўчынку. Ей сёння споўняецца тры гады. Сын запрашае вас на яе імяніны.

Ей зрабілася ніякавата перад другімі пацыентамі. Нешта вельмі дзіўным здавалася першае запрашэнне, другое... Яна наогул дзівілася з таго, што раён наведвае яе прыватны пакой і што гэтае наведванне прыме масавы характар.

— Вы не пазнаеце мяне? — Сямігадовае дзіцё, якое стаяла каля дактаркі, падняло ўверх вочкі і ўчапілася ручкамі за турэцкі халат Веры. — Мне тады душыла ў горле і вы памазалі мне горла, далі лякарства, і я хутка ачуняў.

— Так, я памятаю. Дык што ты хочаш?

— Бацька атрымаў патэфон і радыё.

— Мяне радуе гэта,—адказала Койль, як адказваюць даросламу.

— І сёння да нас прыдуць рабочыя.

— Вельмі рада!

— Можа, і не рада, але бацька і маці запрасілі вас да нас на вячэру.

Койль не паверыла-б, калі-б яна гэта сама не перажыла, калі-б яна не бачыла гэта сваімі ўласнымі вачыма. У яе з'явілася думка, што таксама і астатнія людзі, якія стаяць у чарзе, прышлі сюды, каб запрасіць яе на іхныя ўрачыстасці. Яна не памылілася. Так гэта і было.

— Мая дзяўчынка, якую вы лячылі, — прыгадала маладая ўдзячная маці, — вытрымала экзамен і паступіла ў музтэхнікум. З гэтай прычыны ў мяне сёння вечар з канцэртам. Вы абавязкова павінны прыйсці да нас. Мы простыя рабочыя, і калі вы не прыдзеце, дык вы пакрыўдзіце нас.

— З прычыны таго, што бацька прэміраваны за стаханаўскія нормы, фабрыка наладжвае ў нас вечар. Мы хочам, каб вы абавязкова былі сярод нашых гасцей...

Прышоў кампазітар. Гладзячы сваімі кволымі рукамі голы чэрап, ён запрасіў Веру Койль на яго юбілей.

Мастак, дзяцей якога яна лячыла, прышоў сюды, каб дагаварыцца з ёй аб тым, калі яна мае час пазіраваць. Ен цвёрда вырашыў намаляваць яе партрэт.

4.

У Койль закружылася галава ад нечаканасці. У яе з'явілася думка, што яе добры знаёмы, малады доктар, які да яе няроўнадушны, гэтую раніцу інсцэніраваў. Ен спрабуе рознымі сродкамі вызваліць яе ад Рэлінавага ўплыву...

Але шмат думаць яна не магла. Яна пачула гучную, працяглую сірэну каля пад'езду яе хаты. Расчыніліся дзверы і да яе ўвайшоў малады рабочы, які гэтымі днямі быў прэміраваны машынай. Яго партрэт друкаваўся ў газетах.

— Можа-б вы абнавілі маю машыну, — пачаў рабочы. — Я прышоў па вас.

Уласнік машыны быў маладым і меў сімпатычны выгляд. Ен правёў Веру да машыны, адчыніў дзверцы кабінкі, пасадзіў Веру каля сябе, і машына кранулася з месца.

«Я пакінула адчыненым мой пакой», — раптам успомніла Койль. Але гаспадар машыны не пачуў, што гаварыла Койль. Ен трымаў руль вельмі напружана і ўсхвалявана, як гэта бывае з закаханымі ў першы раз шоферамі. У гэты момант ён скіраваў машыну, каб не наехаць на прахожага, і ад гэтага павароту Вера прачнулася.

5.

Стукалі да яе ў пакой. Яна саскочыла з ложка, усё яшчэ знаходзячыся пад уплывам гэтага дзіўнага сну, які яна так добра памятала.

— Хто стукае?—запытала Вера.

Замест чалавечага голасу яна пачула другі прыглушаны стук, асцярожны, які ў зімовым перадранішнім змроку выклікаў жаль і хваляванне.

«Зноў пацыент, цяпер, у зімовую завіруху...»

— Хто стукае?—пачала Койль злавацца.

Зноў тупы, насмешлівы стук.

— Адкажыце, нарэшце, хто? — запытала яна, стоячы каля дзвярэй.

— Адчыні, Верка,—пачула Койль.

Яна не пазнала голасу Рэліна. Ей зрабілася няёмка за свае думкі, што гэта стукае Рэлін. Яна яшчэ раз запыталa:—Хто там?

— Я,—адказаў Рэлін.

— Рэлін? — ледзь стрымала сябе ад хвалявання Койль.

— Поўгадзіны, як я стукаю і не магу дастукацца, — адказаў Рэлін.

Ен увайшоў у пакой у кажусе, футравых ботах, з цяжкім чамаданам у руках. Першы раз увайшоў Рэлін у гэты пакой, як да сябе ў хату. Першы раз холад, які Рэлін прынёс з сабой, выклікаў узрушанасць у гэтай жанчыны.

Хвалюючыся, апавядала Вера аб сваім сне, а Рэлін, які заўсёды спрабуе звычайныя падзеі ўзняць на праблемную вышыню, растлумачыў:

— Твой сон мае рэальную падставу. Усё-ж гэта магло здарыцца ў сапраўднасці. Так, абавязкова. Але лепшае, весялейшае жыццё не прыходзіць само да цябе. Трэба ўмець арганізаваць, наладзіць... Элементаў радасці і шчасця ў нас даволі, мы павінны толькі гэта як след арганізаваць. Увага да блізкіх сяброў, знаёмых — без гэтага немагчыма радасць і шчасце ў нашым жыцці.

Вера праектавала вечар для сваіх малых пацыентаў, а Рэлін з гэтым згадзіўся. Вера сказала:

— Мы запросім таксама нашага паштальёна.

— Абавязкова, абавязкова, — адказаў Рэлін.

Ен стаміўся з дарогі і на ўсё згаджаўся ў гэту прыгожую, зімовую раніцу.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Друкарня «Звязды». «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газэты: Менск, Совецкая 68, Дом пісьменніка. Тэлефон сакратарыята 25-394, рэдактара 20-831. Уп. Галоўлітбела № 4230.